

БІТВА ЗА ДНЕПР

7

ЯК ВЫБРАЦЬ ПУХАВІК

13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 СНЕЖНЯ 2023 г. СУБОТА № 234 (30114)





Фота БелТА.

З першых вуснаў

# «У НАС НЯМА МАРАЛЬНАГА ПРАВА ЖЫЦЬ ТОЛЬКІ ДЛЯ СЯБЕ»

**Гэтым словам Лукашэнкі апладзіравалі стоячы. Поўная размова Прэзідэнта на кліматычным саміце ў Дубаі**

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 снежня выступіў на пленарным пасяджэнні Сусветнага саміту па барацьбе са змяненнем клімату. У час сваёй прамовы кіраўнік дзяржавы, відаць, адышоў ад запланаваных тэзісаў і дадаў рэзкасці свайму выступленню. У выніку словам беларускага лідара заапладзіравалі ў зале (магчыма, за выключэннем першых выступоўцаў — пра іх Аляксандр Лукашэнка выкажацца пазней). І гэта былі ўжо не радавыя апладысменты, якія гучаць у падзяку кожнаму выступоўцу, — кіраўніку нашай дзяржавы апладзіравалі стоячы. Прыводзім выступленне Прэзідэнта Беларусі цалкам.**

Спадар старшыня!

Паважаныя ўдзельнікі нашага форуму!

Перш за ўсё традыцыйна хачу падзякаваць кіраўніцтву Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў за гасціннасць і высокі ўзровень арганізацыі гэтай канферэнцыі. Няпросты канферэнцыі, на якую прыбыло толькі кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў больш, чым прыязджае на сесію Генеральнай Асамблеі ААН.

Сёння мы, лідары дзяржаў свету, гаворым аб будучыні планеты Зямля — нашага агульнага дома. Іншага дома ў нас не было і не будзе. Гаворым аб будучыні сваіх дзяцей і ўнукаў. Аб будучыні ўсіх, хто прыйдзе ў гэты свет пасля нас.

Мы прадстаўляем розныя культуры, розныя сістэмы каштоўнасцяў, розныя цывілізацыі. Але мы адзіныя перад абліччам глабальнага выкліку, які кінула нам сама прырода.

Клімат мяняецца. Навукоўцы робяць самыя змрочныя прагнозы. Тое, што мы чуем іх і рэагуем, вельмі прагрэсіўна. Але каб эфектыўна супрацьстаяць пагрозе, неабходна шчыра і адкрыта назваць яе першапрычыны.

Перш за ўсё гэта адсутнасць пачуцця меры ў імкненні да геапалітычнай, у тым ліку ваеннай (я сказаў бы, перш за ўсё ваеннай), перавагі тых, хто правакуе і распальвае ачагі войн у розных кутках планеты. А войны з'яўляюцца галоўнай крыніцай бруду на нашым кантыненце. Гэта прага нажывы, якая ператварае прыродныя рэсурсы ў асабісты капітал і абкрадвае будучыя пакаленні. Гэта спробы прыбраць са свайго шляху краіны, якія перашкаджаюць падпарадкаваць увесь свет, і разбурыць, выцягнуўшы з зямлі ўсе сокі. І робіцца ўсё часам нібыта ў мэтах устойлівага развіцця (ёсць такая праграма ў ААН).

Беларусь паводле Парыжскага пагаднення ў поўнай меры выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы і нават перавыконвае іх. Мы аказваем бясцэнныя экасістэмныя паслугі нашаму кантыненту, захоўваючы ўнікальную крыніцу кіслароду — натуральныя балоты, лясы, лёгкія Еўропы. Развіваем зялёную і атамную энергетыку, мінімізуючы рызыкі змены клімату.

Парадаксальна, але ў адказ атрымліваем новыя эканамічныя санкцыі, бар'еры ў міжнародным гандлі, абмежаванне доступу да тэхналогій. І не толькі мы.

Час прызнаць: зялёны парадак дня бессэнсоўны ва ўмовах канфрантацыі. Ён патрабуе павагі да суверэнітэту краін і безумоўнай справядлівасці.

Нельга ціснуць палітычных апанентаў санкцыямі і ў той жа час патрабаваць затратных для нацыянальных эканомік рашэнняў. Рашэнняў, ад якіх залежыць чысціня ўсёй атмасферы, усіх грунтавых вод і сусветнага акіяна. І яшчэ: як можна чакаць дарагіх эфектыўных мер па захаванні клімату ад краін і народаў, якія да гэтага часу не акрыялі ад каланіяльнага прыгнёту?

Зыходзячы з гэтага, Беларусь заклікае ўсіх, хто абавязаны ўзяць на сябе цяжар гістарычнай адказнасці: першае — уносіць суразмерны ўклад у вырашэнне пытанняў кліматычнай бяспекі за ўсе стагоддзі бяздумнага стаўлення да прыроды; па-другое, узмацніць падтрымку краін, якія сталі на шлях развіцця, і дзяржаў з пераходнай эканомікай; трэцяе — перастаць выказваць «заклапочанасць» і пачаць дзейнічаць у імя захавання жыцця на Зямлі.

Напэўна, чарговы раз мы тут сабраліся і чарговы раз выкажам сваю заклапочанасць, на жаль. Праз тыдзень усе забудуцца.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- Амаль 62 тысячы грамадзян Украіны заехалі ў Беларусь з пачатку 2023 года.
- **«АМКАДОР» пашырыць супрацоўніцтва з Рэспублікай Марый Эл.**
- Домік Дзеда Мароза адкрыецца ў Мінскім заапарку 23 снежня.
- **У РНПЦ дзіцячай хірургіі правялі чатыры аперацыі дзецям з рэдкім прыроджаным парокам сэрца.**
- Праз БУТБ пачаліся пастаўкі піламатэрыялаў у Рэспубліку Карэя.
- **Беларусь плануе ў 2024 годзе нарасціць экспарт у краіны Афрыкі не менш як у 2,5 раза.**

З нагоды

# ТАМ, ДЗЕ ЧУЮЦЬ БЕЗ СЛОЎ

**Трэцяга снежня ў Беларусі адзначаюць Дзень інвалідаў, але такія людзі, як правіла, вельмі не любяць гэта азначэнне і ўсё жыццё імкнуцца даказаць грамадству, што яны такія ж, як і ўсе. У гісторыі ёсць нямала прыкладаў, калі людзі з абмежаванымі магчымасцямі дасягалі высокіх творчых, навуковых і спартыўных вяршынь, выкарыстоўваючы развіція яшчэ ў дзяцінстве здольнасці. Такія імёны беларускай і сусветнай велічыні ёсць і ў летапісе Віцебскай спецыяльнай школы-інтэрната, якая амаль паўстагоддзя выпускае ў дарослае жыццё моцных і сацыялізаваных дзяцей з парушэннямі слыху.**



Пяцікласнікі Аліса ВАСЬКОВІЧ і Святаслаў ДУБКОЎ на карэкцыйных занятках.

Кожны дзень тут, як і ў звычайнай школе, праходзіць па раскладзе: урокі ў першай палове дня, спартыўныя спаборніцтвы, тупат на школьным калідоры... Адзінае, што адрозніваe ўстанову ад іншых — цішыня, адзіночныя школьныя парты і карэкцыйныя заняткі. А яшчэ тое, што кожны настаўнік і выхавацель на тыдні (а для кагосьці — і на доўгія гады) становіцца другой мамай.

СТАР. 4

Дзяржаўны інтарэс

# КАКАВАВЭЛА І ВІНАГРАДНЫЯ ЖАМЕРЫНЫ

## Беражлівае стаўленне да прадуктаў харчавання — трэнд будучыні



**У 1970—1980-х паняцце «ежа будучыні» асацыіравалася выключна з упакоўкай, ну і з пюрэпадобнай кансістэнцыяй: смажаную бульбу, суп або каўбасу пісьменнікі-фантасты проста «ўпакоўвалі» ў цюбікі, каб зручна было спажываць гэтыя стравы ў бязважкасці падчас касмічных пералётаў. У XX стагоддзі паняцце «будучыня» ў свядомасці людзей было наогул неаддзельным ад космасу — ад міжгалактычных падарожжаў і каланізацыі іншых планет...**

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

23234

9 771990 763008


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «У НАС НЯМА МАРАЛЬНАГА ПРАВА ЖЫЦЬ ТОЛЬКІ ДЛЯ СЯБЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У нас няма маральнага права жыць толькі для сябе. Мы павінны зазіраць за гарызонт, паважаць законы прыроды і ствараць аснову для працягу чалавечага роду тут і цяпер на нашай планеце. Іншага дома ў нас няма і не будзе.

І напрыканцы. Усе прамоўцы, асабліва прамоўцы з выступоўцаў, якія выступалі тут першымі, заклапаціліся: а дзе ўзяць грошы? Ды кіньце вы. Нават журналіст, які сядзіць тут, вам скажа, дзе ўзяць грошы. Каб адказаць на гэтае пытанне, трэба зазірнуць у нядаўнюю гісторыю. Прыклад. Каб знішчыць Ірак і Афганістан і прыўнесці ў гэтыя краіны «дабро» для народаў, патрачана, паводле ацэнак, ад паўтара да двух трыльёнаў долараў. Ірак і Афганістан абышліся агрэсару каля двух трыльёнаў долараў. А палічыце, колькі грошай пайшло на тое, каб абараніць гэтыя краіны? А колькі людзей загінула? Гэта ў доларах не ацэніш. Сёння ідзе вайна ва Украіне. Гэта ўжо не паўтара-два трыльёны долараў. Гэта ўжо абыдзецца ў пяць трыльёнаў долараў, калі ўдасца дамовіцца найбліжэйшым часам аб міры.

Чаму сёння няма міру ў гэтай частцы планеты? Таму што тыя прамоўцы, якія выступалі ў першых шэрагах, гавораць і аб міры, гавораць аб тым, каб планета была чыстай, заклапаціліся аб унуках, а ў той жа час развязалі і вядуць самую страшную вайну на планеце.

А на Блізкім Усходзе колькі будзе каштаваць бойня? А калі ўспыхне ў Ціхім акіяне? Гэта трыльёны, трыльёны долараў. Дык давайце іх накіруем на чысціню планеты. І не трэба будзе шукаць, як у нас кажуць, «па завуголлі» гэтыя грошы.

Мы тут сабраліся дзеля таго, каб чарговы раз выказаць заклапочанасць. А тыя, што тут выступалі ў першых шэрагах, «заклапочаныя за ўнукаў», яны ж вядуць гэтыя войны. А войны — гэта страшнае забруджванне планеты. Давайце гэта спынім. Таму самае галоўнае — нам трэба навучыцца казаць менш слоў, а больш рабіць.

Я разумею: калі мы прымем нейкую дэкларацыю ці мемарандум, як у нас заўсёды бывае, мы наўрад ці нечага даб'ёмся. Як тут казалі, ізноў жа, у пачатку выступоўцы, 80 % бруду на планеце — гэта ад 20 вядучых дзяржаў. Давайце ў сваю дэкларацыю, спадар старшыня, запішам не заклапочанасць, а запатрабуем ад іх скарацiць хоць бы напалову выкіды ў атмасферу. Мы гэтага не зробім. Дык чаго сабраліся? Вось яны грошы, жывыя грошы. 10 трыльёнаў долараў, якія мы можам, спыніўшы войны, накіраваць на ачышчэнне нашай планеты.

І давайце дзейнічаць. Не пачнём дзейнічаць — прырода прымусіць нас жыць па яе законах.

Дзякуй вам.

# «ГАЛОЎНАЕ — НЕ СПЫНЯЦЦА»

**У кулуарах Сусветнага саміту па барацьбе са змяненнем клімату Аляксандр Лукашэнка правёў шэраг сустрэч са сваімі калегамі. У прыватнасці, з лідарамі Азербайджана, Сербіі, Кубы, Зімбабвэ, Экватарыяльнай Гвінеі, Конга, Тога і лідарам Каморскіх Астравоў, які з'яўляецца старшынёй Афрыканскага саюза. Таксама Прэзідэнт сустрэўся з кіраўнікамі Мазамбіка, Руанды і Батсваны.**

Падчас перагавораў з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвай кіраўнік дзяржавы адзначыў, што напярэдадні саміту двум лідарам удалося грунтоўна перагаварыць і абмеркаваць галоўныя пытанні. Аляксандр Лукашэнка павіншаваў свайго калегу з пераканаўчай перамогай на прэзідэнцкіх выбарах і сказаў, што Эмерсана Мнангагву чакаюць у Беларусі.

Гаворачы аб двухбаковых адносінах, беларускі лідар падкрэсліў, што самае галоўнае цяпер для Беларусі і Зімбабвэ — не спыняцца. «Так, мы маем пэўныя вынікі нашага супрацоўніцтва, як вы ўжо гаварылі, але ў нас яшчэ шмат работы ў вашай краіне, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гатовы рэалізаваць той план, які мы намецілі ў час майго візіту ў Зімбабвэ».

Прэзідэнт Беларусі адзначыў таксама поспехі Зімбабвэ ў развіцці аграпрамысловага комплексу. Гэта стала магчымым у тым ліку дзякуючы супрацоўніцтву з Беларуссю, пастаўкам сучаснай сельгастэхнікі. «І збожжа вы пачалі экспартаваць, і гэтак далей», — удакладніў ён.

«Калі лепш прыехаць: зімой ці летам?» — пацікавіўся ў свайго калегі Эмерсан Мнангагва.

«Вядома, зімой!» — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Зіма для мяне крыху цяжкая... — прызнаўся Прэзідэнт Зімбабвэ. — Падумаю, у які час прыехаць. Але мой дарагі сябар, Прэзідэнт Беларусі, можа прыязджаць у Зімбабвэ са студзеня да снежня!»

«Дамовіліся!» — рэзюмаваў беларускі лідар.

На перагаворах з Прэзідэнтам Кеніі Ульямам Руто Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што разам са сваім калегам яны ўжо абмяняліся некалькімі фразамі і меркаваннямі. «Для таго каб нам грунтоўна і перагаварыць, і наладзіць нашы адносіны (у імя чаго мы размаўляць будзем), я думаю, вы маглі б прыехаць да нас, я мог бы прыехаць у зручны час да вас, — прапанаваў беларускі лідар. — У выніку гэтых візітаў нашы спецыялісты папрацавалі б (сапраўды так, як з Зімбабвэ і Экватарыяльнай Гвінеяй), і мы змаглі б выбудаваць нейкі план нашага супрацоўніцтва, разумеючы, што трэба вам ад нас. І мы б паглядзелі на вашу краіну і вызначыліся з нашымі патрэбамі».

У лістападзе кіраўнік беларускай дзяржавы накіроўваў Прэзідэнту Кеніі віншаванне з 30-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі. У сваім пасланні Аляксандр Лукашэнка адзначаў, што дыялог паміж Мінскам і Найробі мае паслядоўны і паступальны характар, вызначаны прыярытэтныя кірункі для сумеснай работы, сярод якіх механізацыя сельскай гаспадаркі Кеніі, пастаўка беларускіх прадуктаў харчавання, развіццё бізнес-кантактаў.

«Перакананы, што настаў час канвертаваць назапашаны за трыццаць гадоў патэнцыял у канкрэтныя вынікі, — падкрэсліў падчас перагавораў Аляксандр Лукашэнка. — Прапаную прадметна абмеркаваць усе магчымыя сферы агульнай цікавасці ў час вашага візіту ў Мінск, які перавядзе наша ўзаемадзеянне на якасна новы ўзровень».

**Паводле БелТА.**

# ПРАВА Ў ТРЭНДЗЕ І СВЕЦЕ

## Што абмяркоўвалі на форуме Саюза юрыстаў

**Пытанні лічбавізацыі ўсіх сфер эканомікі; абарона нацыянальнай бяспекі; рэалізацыя канцэпцыі прававой палітыкі, прынятай два дні таму; ахова персанальных даных (у тым ліку ў кіберпрасторы); стварэнне прыватна-дзяржаўнага партнёрства ў юрыдычнай сферы. Гэтыя і шмат якія іншыя кірункі развіцця права цягам двух дзён абмяркоўвалі спецыялісты ў рамках 22 тэматычных секцый і пленарнага пасяджэння падчас правядзення форуму Саюза юрыстаў «Права ў сучасным свеце».**



### ДЗЯРЖАЎНА-ПРЫВАТНАЕ ПАРТНЁРСТВА

Права — не проста рэгулятар грамадскіх адносін, але і адзін з найважнейшых фактараў забеспячэння нацыянальнай бяспекі, дзяржаўнага будаўніцтва, сацыяльна-эканамічнага развіцця і кансалідацыі грамадства вакол базавых каштоўнасцяў, якія замацаваны ў Канстытуцыі, адзначалі ўдзельнікі форуму.

Форум праходзіць у незвычайны час, які трансфармуецца. Мяняецца міжнародны парадак дня, эканамічныя адносіны, адпаведна, права павінна адлюстроўваць актуальі і чуйна рэагаваць як на ўнутрырэспубліканскія змены, так і на міжнародныя адносіны, адзначыла **Вольга ЧУПРЫС, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта**:

— Саюз юрыстаў імкнецца быць у трэндзе, таму сёлета ён правёў апгрэйд сваёй пляцоўкі і адлюстраваў на форуме ўсе найбольш актуальныя пытанні: захаванне гістарычнай памяці і праўды аб Вялікай Айчыннай вайне, суверэнітэце Беларусі, прымяненне блакчэйн-тэхналогій, лічбавізацыя, эканамічныя праваадносіны, звязаныя з прымяненнем медыяцыі і новых форм гаспадарчага працэсу. Было разгледжана шмат пытанняў, якія датычацца маладзёжнай тэмы.

Юрысты працуюць у многіх сферах, забяспечваюць інтарэсы як прыватнага бізнесу, так і дзяржаўныя. І вельмі важна сумясціць гэтыя інтарэсы. Пляцоўка Саюза юрыстаў мусіць стаць месцам, дзе будзе дасягнута дзяржаўна-прыватнае партнёрства, удакладніла спікер:

— Усе прапановы павінны быць не рэвалюцыйнымі, а забяспечваць паступовае трансфармаванне грамадскіх адносін, інакш настане хаос. На ўсе змены, якія нам падкідвае жыццё, трэба тэрмінова рэагаваць, практычна без аглядкі на інтарэсы іншых дзяржаў прымаць тыя рашэнні, якія важныя для нас.

Лічбавізацыя адміністрацыйных працэдур адбываецца для таго, каб паставіць тэхналогіі на службу грамадзян. Сёння ў закон «Аб асновах адміністрацыйных працэдур» прыняты чарговыя змены, якія ў найбліжэйшы час будуць падпісаны, выказала надзею Вольга Чупрыс.

### НАТАРЫЯТ У ЛІЧБЕ

Мяркуецца, што да 2030 года практычна ўсе натарыяльныя дзеянні (для тых грамадзян, якія захочуць атрымліваць іх з канапы) могуць быць пераведзены ў лічбавы фармат. А вось дзевяць натарыяльных дзеянняў, якія можна будзе здзяйсняць аддалена, з'явяцца ў найбліжэйшыя паўгода ў рамках адкарэкціраванага Закона «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці», які рыхтуецца парламентам да другога чытання. Натарыят убудоўваецца ў сістэму лічбавізацыі ўсіх сфер грамадскіх адносін і ў пэўным сэнсе выступае драйверам фарміравання лічбавага асяроддзя, таму што аўтаматызацыя працэсаў у рамках натарыяльнай дзейнасці і здзяйсненне натарыяльных дзеянняў даўно распачата, адзначыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты (БНП)**:

— Гэта, у прыватнасці, прыняцце ў дэпазіт грашовых сродкаў і каштоўных папер, выдача дублікатаў натарыяльных дакументаў, пасведчанняў аб праве на спадчыну, пасведчанняў аб праве ўласнасці. Без наведвання натарыуса можна будзе таксама забяспечваць пісьмовыя доказы для вядзення спраў у судах, а таксама сведчыць дакладнасць перакладу дакумента з адной мовы на іншую.

Важна стварыць максімальна камфортныя ўмовы для тых, хто зацікаўлены ў атрыманні натарыяльных дзеянняў і пры гэтым не згубіць у якасці. Варта, пэўна, нівеліраваць некаторыя моманты, якія могуць быць выкліканы так званай лічбавай няроўнасцю, бо мы працуем не толькі з моладдзю, але і з людзьмі паважанага ўзросту, якія не настолькі добра разумеюць, што такое лічба ці гаджэт і, магчыма, не ведаюць, як можна націснуць на кнопку, каб пастукацца ў пэўны дзяржорган, каб вырашыць пэўнае пытанне, удакладніла старшыня БНП:

— Аўтаматызацыя — гэта добра, аднак важна, каб інфармацыйныя тэхналогіі не падмянілі сабой адносіны паміж спецыялістам і зацікаўленым бокам, падчас якіх павінны быць выяўлены сапраўдная воля і намер боку па дасягненні пэўнага прававога выніку. А натарыус павінен мець магчымасць данесці да ўдзельніка натарыяльнага дзеяння тыя прававыя наступствы адносна самога сябе, якія ён панясе ў выніку сваіх дзеянняў.

### АБМЕРКАВАЦЬ, ВЫПРАЦАВАЦЬ, РЭАЛІЗАВАЦЬ...

Мяркуючы па коле ўдзельнікаў, шырыні тэм і пытанняў, якія ўздымаліся, форум стаў пляцоўкай для прафесійнага абмеркавання юрыдычнай суполкай актуальных пытанняў удасканалення прававога рэгулявання, правапрымяняльнай практыкі і актыўнага абмену вопытам, падвёў вынікі двухдзённай работы **Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў**:

У рамках работы секцыі «Суверэнітэт і права», напрыклад, цэнтральнае месца заняла тэма народаўладдзя як найвышэйшай формы ўдзелу грамадзян у кіраванні справамі дзяржавы. Менавіта ўмацаванне ролі прадстаўнічай дэмакратыі стала найважнейшым вынікам канстытуцыйнай рэформы ў краіне. Абмеркаваны практычныя аспекты рэалізацыі зацверджанай кіраўніком дзяржавы Канцэпцыі прававой палітыкі, а таксама асноўныя палажэнні праекта Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, які будзе вынесены на разгляд першым складам Усебеларускага народнага сходу.

Секцыя «Правасуддзе і абарона правоў грамадзян» была прысвечана абмеркаванню актуальных пытанняў дзейнасці Канстытуцыйнага суда і судоў агульнай юрысдыкцыі па рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян на судовую абарону. Абноўленая Канстытуцыя і прынятыя парламентам цягам 2022—2023 гг. законы выклікалі ўключэнне ў прававую сістэму краіны новых механізмаў судовай абароны грамадзян.

Укараненне ва ўсе сферы дзейнасці лічбавых тэхналогій выводзіць на першы план пытанні лічбавізацыі дзяржаўнага ўпраўлення і фінансаў, абароны персанальных даных, супрацьдзеяння правапарушэнням у сферы высокіх тэхналогій, якія і сталі галоўным пытаннем на секцыі «Лічбавае права».

На секцыі «Прававыя механізмы абароны правоў і інтарэсаў дзяцей і моладзі» сумесна абмяркоўвалі натарыусы, адвакаты, медыятары, пракуроры. Размова датычылася, напрыклад, таго, як дзяржава стварае механізмы па самаразвіцці ў частцы навучання, спорту, навуковай і творчай дзейнасці. У гутарцы закранулі таксама пытанні забеспячэння абароны маёмасных правоў непаўналетніх, якія ўдзельнічаюць у грамадзянскім абароце. Іх інтарэсы павінны быць забяспечаны, адзначыла Наталля Барысенка:

— Нас як натарыусаў цікавяць, якія механізмы існуюць па замяшчэнні адсутнай недзеяздольнасці непаўналетніх (да 18 гадоў яны не маюць поўнай дзеяздольнасці). У прыватнасці, абмяркоўвалі функцыі органаў апекі і папячыцельства для забеспячэння інтарэсаў непаўналетніх. У рамках секцыі выпрацавалі пытанні, якія будзе неабходна рэгуляваць у тым ліку і на ўзроўні заканадаўства.

Падсумоўваючы вынікі двухдзённай работы, удзельнікі форуму адзначалі, што падобных выпрацаваных сумесна прапаноў шмат і далейшае ўдасканаленне прававых стасункаў у краіне працягнецца.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

Выбары-2024

# «НАЙВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА — ГАРАНТАВАЦЬ БЯСПЕКУ»

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні калегіі МУС

**Напярэдадні галоўнай грамадска-палітычнай падзеі нашай краіны — адзінага дня галасавання — абмеркавалі падрыхтоўку да правядзення выбарчай кампаніі 2024 года, а таксама дзейнасць аператыўна-дзяжурных службаў у гэты адказны перыяд.**


Фота БелТА.

### «КАБ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ БЫЛІ МІР, СТАБІЛЬНАСЦЬ, ПРАВАПАРАДАК»

Звяртаючыся да ўдзельнікаў калегіі Міністэрства ўнутраных спраў, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што рэферэндум 2022 года паказаў наяўнасць у органаў унутраных спраў дакладнага алгарытму правядзення такіх кампаній. «У мяне заўсёды была вялікая павага да сілавых структур, бо разам мы працуем над агульнымі задачамі па забеспячэнні спакою грамадзян і парадку на вуліцах, — удакладніла Наталля Качанава. — І ў цяперашні няпросты перыяд мы павінны, выявіўшы магчымыя вузкія месцы, своечасова іх пашырыць і вырашыць. Разам са стварэннем належных умоў для работы выбарчых участкаў і гатоўнасцю жорстка спыняць правакацыі найважнейшая задача — гарантаваць бяспеку прадстаўнікоў участковых камісій. Упэўнена: прысутныя ў зале кіраўнікі, іх калектывы робяць усё, каб на нашай зямлі былі мір, стабільнасць, правапарадак».

Спікер верхняй палаты парламента спынілася на рэалізацыі заканадаўчых навацый, неабходнасці актывізацыі работы з грамадзянамі, уважлівым стаўленні да кожнага звароту. Кажучы аб пытаннях выхавання падрастаючага пакалення, Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што менавіта Міністэрства ўнутраных спраў першым ініцыявала стварэнне ваенна-патрыятычных клубаў, разумеючы, што за іх выхаванцамі — будучыня нашай краіны.

Дарэчы, перад пачаткам пасяджэння калегіі Старшыня Савета Рэспублікі наведала ваенна-патрыятычны клуб «Рысь», які ажыццяўляе сваю дзейнасць на базе воінскай часці 3214. Наталлі Качанавай прадэманстравалі ўмовы, у якіх выхаванцы ваенна-патрыятычнага клуба праходзяць навучанне. Таксама спікер пагутарыла з будучымі абаронцамі Айчыны. «Рада, што вы выбралі такі занятак, — сказала дзецям Наталля Качанава. — Тут вы атрымліваеце веды і навыкі, каб потым рэалізаваць іх на карысць Айчыны».

### «ВАЖНА СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

Звяртаючыся да ўдзельнікаў калегіі, **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ** падкрэсліў, што перад міліцэйскім ведамствам стаяць значныя і адказныя задачы. «Неабходна ў межах кампетэнцыі прыняць непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, — канкрэтызаваў ён. — Усім кіраўнікам трэба забяспечыць жорсткую выканальніцкую дысцыпліну, максімальную скаардынаванасць дзеянняў з іншымі праваахоўнымі органамі і іншымі зацікаўленымі».

Пры гэтым кіраўнік міліцэйскага ведамства заўважыў, што ў органах унутраных спраў назапашаны багаты досвед працы пры правядзенні розных электаральных кампаній. Аднак, па яго словах, разам з тым расслабляцца не даводзіцца. «Мы павінны нарошчваць аператыўныя пазіцыі, а таксама ўдзяляць належную ўвагу пытанням прафілактыкі правапарушэнняў, — сфармуляваў даручэнні міністр. — Асноўная задача — забеспячэнне аховы грамадскага парадку і бяспекі грамадзян».

Акрамя таго, Іван Кубракоў акцэнтаваў увагу на неабходнасці работы з насельніцтвам. «Важна слухаць і чуць людзей, максімальна аказваць садзейнічанне ў вырашэнні іх праблем, — падкрэсліў міністр унутраных спраў. — Працуйце на апярэджанне, тлумачце, папярэджвайце. Нельга дапусціць правакацый і найменшай дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне. Мы павінны быць гатовы да дзеянняў у асаблівых умовах».

У гэтай сувязі размова ідзе не толькі аб правядзенні вучэнняў і трэніровак, але і аб забеспячэнні неабходнай экіпіроўкай кожнага супрацоўніка, вайскоўца, а таксама якаснае абсталяванне падраздзяленняў.

### СІСТЭМЫ ВІДЭАНАЗІРАННЯ І БАРАЦЬБА З ЭКСТРЭМІСТАМІ

**Сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі Алена БАЛДОЎСКАЯ** расказала ўдзельнікам пасяджэння аб асаблівасцях будучай электаральнай кампаніі, а таксама новаўвядзеннях, звязаных з працэдурай рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты і агітацыі.

Па словах **намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка міліцыі грамадскай бяспекі Юрыя НАЗАРАНКІ**, улічваючы тое, што выбары пройдуць па новых правілах, стануць маштабнай і далёка не лёгкай кампаніяй, падрыхтоўчыя мерапрыемствы беларуская міліцыя пачала загадзя. «На працягу двух гадоў на базе Акадэміі МУС арганізоўваліся вучэбна-метадычныя зборы з прадстаўнікамі дзяржорганаў і ГУУС-УУС, уключанымі ў склад аператыўна-сітуацыйных штабоў, — удакладніў ён. — З супрацоўнікамі органаў унутраных спраў праведзены трэніроўкі па адпрацоўцы дзеянняў у асаблівых умовах, павышэнні ўзроўню гатоўнасці да рэагавання на магчымыя пагрозы. Рэалізаваны задачы па адпрацоўцы першачарговых мер супрацьдзеяння дыверсійна-разведвальным групам і незаконным узброеным фарміраванням. Нямала зроблена для матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання падраздзяленняў, у тым ліку сродкамі абароны і актыўнай абароны, узбраеннем».

Асаблівая ўвага — стварэнню бяспечных умоў на ўчастках для галасавання. У прыватнасці, ідзе работа па абсталяванні гэтых аб'ектаў сістэмамі відэаназірання і ахоўнай сігналізацыі. На ўчастках прадугледжана арганізацыя кругласутачнага дзяжурства супрацоўнікаў міліцыі. Для падтрымання правапарадку на вуліцах у сталіцы, абласных і раённых цэнтрах будуць сфарміраваны дадатковыя патрульныя нарады і групы хуткага рэагавання.

Аб мерах супрацьдзеяння экстрэмізму, якія прымаюцца органамі ўнутраных спраў у электаральны перыяд 2024 года, распавёў **намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі Генадзь КАЗАКЕВІЧ**. «Выбарчая кампанія 2020 года і спроба «каляровай» рэвалюцыі карэнным чынам змяніла нашы падыходы да аховы грамадскага парадку і барацьбы са злачыннасцю, — акцэнтаваў увагу ён. — Сітуацыя дынамічна мяняецца, з'яўляюцца новыя выклікі і пагрозы. Для выключэння спроб зрыву электаральнай кампаніі 2024 года прадугледжаны комплекс мерапрыемстваў. Яны накіраваны ў тым ліку на зніжэнне ўплыву экстрэмісцкіх інтэрнэт-рэсурсаў на грамадскую свядомасць, падтрымку і тлумачэнне ініцыятыў, якія праводзяцца дзяржорганамі, з прыцягненнем папулярных СМІ, лідараў грамадскай думкі. Сярод важных задач — устанаўленне і прыцягненне да адказнасці асоб, якія маюць дачыненне да экстрэмізму, перш за ўсё адміністратараў і актывістаў дэструктыўных сеткавых рэсурсаў, атрыманне інфармацыі, якая дазволіць прагназаваць развіццё абстаноўкі як унутры краіны, так і за яе межамі».

### «УСЁ ПАВІННА ПРАЙСЦІ ЗЛАДЖАНА І АРГАНІЗАВАНА»

У размове з журналістамі Старшыня Савета Рэспублікі канстатавала, што выбарчая кампанія ў нашай краіне заўсёды праводзіцца масава. «Ствараецца вялікая колькасць участковых камісій, якія будуць працаваць у месцах правядзення выбараў, — удакладніла Наталля Качанава. — Таму ўсё павінна прайсці зладжана і арганізавана. Самае галоўнае, каб не было ніякіх эксцэсаў».

Каб забяспечыць арганізаванае правядзенне выбарчай кампаніі, па словах спікера верхняй палаты парламента, праваахоўныя органы павінны спрацаваць вельмі дакладна. «Самае галоўнае — забяспечыць бяспеку нашых грамадзян пры правядзенні гэтага важнага палітычнага мерапрыемства», — падкрэсліла яна.

Свой унёсак, па меркаванні Старшыні Савета Рэспублікі, павінны ўнесці і супрацоўнікі Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі. Яна звярнула ўвагу на тое, што з улікам зімовага перыяду правядзення выбарчай кампаніі неабходна расчысціць пад'езды, падыходы да месцаў правядзення галасавання. «Усё павінна быць арганізавана вельмі якасна, — паставіла задачу Наталля Качанава. — Не павінна быць ніякіх правакацый, эксцэсаў, на гэта будзе накіравана работа тых праваахоўных органаў, якія будуць працаваць на выбарчых участках. Традыцыйна прадстаўнікі праваахоўных органаў будуць забяспечваць парадак у месцах правядзення галасавання».

Адказваючы на пытанне прадстаўнікоў медыя аб гатоўнасці міліцэйскага ведамства да выбараў, Іван Кубракоў адзначыў, што ўсе мерапрыемствы па падрыхтоўцы да выбарчай кампаніі ў органах унутраных спраў пачалі праводзіць ужо даўно. «Гэта і зладжванне асабовага складу, і абследаванне выбарчых участкаў, якія будуць задзейнічаны, і ўстаноўка відэаназірання, — канкрэтызаваў ён. — Але самае галоўнае — гатоўнасць асабовага складу. Сёння я з упэўненасцю магу сказаць, што асабовы склад гатовы да забеспячэння аховы грамадскага парадку пры правядзенні выбарчай кампаніі».

Звяртаючыся да грамадзян, міністр унутраных спраў канстатаваў, што падчас правядзення электаральных кампаній актывізуюцца асабліва тыя, хто знаходзіцца за мяжой, а таксама экстрэмісцкія фарміраванні, якія спрабуюць паўплываць на выбарчыя працэсы, уздзейнічаць на ўчастковыя выбарчыя камісіі. «Адразу хачу сказаць, што мы гатовы забяспечыць асабістую бяспеку як нашых выбаршчыкаў, так і членаў выбарчых камісій, — падкрэсліў кіраўнік ведамства. — Таму хвалявацца не трэба. Бяспека будзе гарантавана. Як ужо было сказана Прэзідэнтам нашай краіны, ніякіх несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не будзе. Мы не дазволім ламаць інфраструктуру нашых гарадоў і ствараць беспарадкі на нашых вуліцах. Упэўнены, што ўсё пройдзе спакойна. Органы ўнутраных спраў гатовы забяспечыць бяспеку нашых гараманзян і бяспеку ў цэлым у Рэспубліцы Беларусь».

**Вераніка КАНЮТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Рэйтынг прэм'ер-міністра Канады абваліўся да 19 працэнтаў



Асабісты рэйтынг Джасціна Трудо, а таксама Ліберальнай партыі Канады, якую ён узначальвае, сур'ёзна абваліўся. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на даныя сацыялагічнага апытання. На дадзены момант рэйтынг Трудо складае ўсяго 19 працэнтаў. За апошні месяц ён упаў на 4,3 працэнтнага пункта. За гэты ж перыяд узрасла падтрымка кіраўніка апазіцыйнай Кансерватыўнай партыі Канады П'ера Пуальеўра. Яго рэйтынг складае крыху больш за 34 працэнты — рост на 2,6 працэнтнага пункта. За чатыры тыдні да 22 працэнтаў знізіўся рэйтынг Ліберальнай партыі Канады. Падзенне склала 3,4 працэнтнага пункта, а ўзровень папулярнасці Кансерватыўнай партыі падняўся на 3,3 працэнтнага пункта і складае 41 працэнт. Як мяркуюць спецыялісты, зніжэнне даверу да прадстаўнікоў Ліберальнай партыі звязана з пагаршэннем узроўню жыцця ў Канадзе, а таксама з цэнамі, якія працягваюць расці. Як адзначыў заснавальнік Nanos Research Нік Нанос, у сітуацыях, калі людзі з цяжкасцю знаходзяць грошы для набыцця прадуктаў харчавання, аплату свайго жылля і выплат узносаў па іпатэцы, губляць ім ужо няма чаго. Тады яны шукаюць спосабы пакараць урад і знайсці яму замену.

### Парламент Эквадора прызнаў экс-прэзідэнта вінаватым у карупцыі



Парламент Эквадора прызнаў былога прэзідэнта Гільерма Ласа вінаватым у крадзяжы бюджэтных сродкаў і перадаў інфармацыю пракуратуры, паведаміла ТАСС. Заканадаўцы лічаць, што Ласа ўдзельнічаў у карупцыйнай схеме ў дзяржаўнай кампаніі FLOPEC, якая займаецца танкернымі перавозкамі нафты. Пры гэтым парламентарыі прызналі, што не могуць забараніць экс-кіраўніку дзяржавы займаць дзяржпасады, паколькі гэта не прадугледжана канстытуцыяй. 17 мая Ласа, тэрмін паўнамоцтваў якога павінен быў скончыцца ў 2025 годзе, падпісаў указ аб роспуску Нацыянальнай асамблеі і правядзенні пазачарговых прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў. 17 лістапада да работы прыступіў новы склад заканадаўчага органа, які вырашыў працягнуць разгляд пытання аб вінаватасці экс-прэзідэнта. 23 лістапада на пасаду прэзідэнта ўступіў Даніэль Набоа, абраны па выніках другога тура, які прайшоў 15 кастрычніка.

### На ўсходзе Кітая знайшлі магільні ўзростам да 5,5 тысячы гадоў



Некалькі збудаванняў, 40 магільняў, і студні ўзростам ад 4,5 да 5,5 тысячы гадоў былі выяўлены падчас раскопак у горадзе Чанчжоу правінцыі Цзянсу, што на ўсходзе Кітая, паведаміла «Сіньхуа». Руіны з мноствам рэліквій, у тым ліку керамікай, нефрытавым посудам і керамагранітам, знойдзены на стаянцы Сідун у сучасным раёне Цзянінь у Чанчжоу. Даследчыкі з Нанкінскага музея праводзяць раскопкі ў гэтым рэгіёне з 2019 года. Эксперты мяркуюць, што дадзеная стаянка адкрывае новую перспектыву для вывучэння мадэлі развіцця рэгіянальнай цывілізацыі ў нізоўях ракі Янцзы ў старажытныя часы.

# ТАМ, ДЗЕ ЧУЮЦЬ БЕЗ СЛОЎ

## ЗВЫЧАЙНЫ РАСКЛАД НЕЗВЫЧАЙНЫХ ЛЮДЗЕЙ

Віцебская спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для дзяцей са слабым слыхам і познааглухлых пачала свой шлях у 1977 годзе. З 2004 да 2012 года ў школе працавалі класы для дзяцей з парушэннем функцый апорнарухальнага апарата, тады заняткі праходзілі на партах-лежаках. А з верасня 2023 года па шматлікіх просьбах бацькоў тут пачалі навучацца дзеці з парушэннямі аўтыстычнага спектру.

Цяпер у школе-інтэрнаце навучаюцца 92 чалавекі ва ўзросце ад 3 да 19 гадоў. Адукацыйны працэс будуецца на трох ступенях: пачатковая школа (1—5 клас), базавая (6—10 клас) і сярэдняя (11—12 клас) — з улікам індывідуальных асаблівасцяў кожнага дзіцяці. Спецыяльная ўстанова з'яўляецца адзінай у паўночным рэгіёне, таму яе выхаванцы — жыхары не толькі горада Віцебска, але і іншых раёнаў вобласці. Трапіць у школу можна толькі па накіраванні з Цэнтра карэкцыйнага навучання, і чарга з бацькоў, чыім дзецям трэба такая дапамога, даволі вялікая. Тут, дзякуючы багатаму вопыту педагогаў, напрацаваным методыкам і сучаснаму карэкцыйнаму абсталяванню, запускаюць мову дзецям, якія не чуюць зусім. І гэта, лічыць дырэктар установы Алена Акімава, вышэйшы пілатаж кожнага члена вялікага калектыву.

Дзеці з горада штодзень пасля заняткаў вяртаюцца дадому, навучэнцы з аддаленых раёнаў жывуць ў інтэрнаце па некалькі тыдняў і прыязджаюць да бацькоў на выхадныя і канікулы, а для пяцярых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія засталіся без апекі бацькоў, інтэрнат стаў домам... Дзеці пражываюць у трохспальных пакоях, для ўсіх — карэкцыйныя заняткі, спартыўная і трэнажорныя залы, бібліятэка, працоўныя майстэрні і гурткі па інтарэсах. Адным словам, створаны камфортныя ўмовы для таго, каб атрымліваць веды, развіваць здольнасці і ўваходзіць у самастойнае жыццё. Для гарадскіх навучэнцаў арганізаваны падвоз, ён, як і харчаванне, пражыванне, падручнікі, бясплатны.

Але дапамога і падтрымка патрэбны не толькі дзецям з асаблівасцямі здароўя, але і іх бацькам. Часта ў сям'і, дзе нарадзілася дзіця з парушэннем слыху, дарослыя не ведаюць, як наладзіць з ім зносіны. Асвоіць жэставую мову самастойна складана, да таго ж некаторыя затрымліваюцца ў стадыі непрыняцця сітуацыі. Акрамя вялікай псіхалагічнай работы, якую праводзіць педагагічны калектыў школы з бацькамі, на базе інтэрната працуюць бясплатныя курсы жэставай мовы для ўсіх ахвотных.

Алена Валер'еўна Акімава ўзначальвае інтэрнат пяты год. Дырэктар прызнаецца, што раней не працавала з асаблівымі дзецьмі і першы год быў самым складаным, але любыя цяжкасці загартоўваюць як дарослых, так і дзяцей. «За гэтыя гады мы змаглі ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу: у снежні 2022 года з дапамогай спонсараў былі адкрыты два новыя кабінеты інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, абноўлена спартыўная база. Хочацца выказаць словы падзякі нашым спонсарам, кіраўнікам арганізацый, якія працягваюць руку дапамогі. Мы імкнёмся зрабіць усё магчымае, каб дзецям было камфортна вучыцца, і гэта дае пэўныя вынікі: нашы выхаванцы з парушэннямі слыху пасля заканчэння дашкольнага аддзялення паспяхова вучацца ў звычайнай школе. Мы дапамагаем кожнаму выпускніку, суправаджаем яго, і перамога нашага калектыву ў тым, што ўсе дзеці, якія выйшлі з гэтых сцен у самастойнае жыццё, сталі дастойнымі людзьмі», — адзначае Алена Валер'еўна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## АЎТАРЫТЭТ ПАЦВЕРДЖАНЫ ГАДАМІ

Канешне, установа спецыяльнай адукацыі не была б такой вядомай без напрацаванага за доўгія гады аўтарытэту. Для многіх педагогаў, якія дзень за днём без рэшты аддаюць сваё сэрца дзецям, інтэрнат — адзіны запіс у працоўнай кніжцы. Настаўнік жэставай мовы і геаграфіі Інеса Яўгенаўна Гічэўская за 24 гады выпусціла не адно пакаленне вучняў. Спачатку была выхавацелем, а пасля атрымала другую адукацыю па спецыяльнасці «Сурдапедагогіка» і стала вучыць малых мове іх зносін. Яе цяперашнія вучні — 40 чалавек з шостага па дванаццаты класы. Менавіта яна і вядзе курсы жэставай мовы для бацькоў, настаўнікаў з іншых школ і студэнтаў. Інэса Яўгенаўна разважае, што ніколі не думала змяніць прафесію.


Настаўнік жэставай мовы і геаграфіі Інеса ГІЧЭЎСКАЯ са сваімі вучнямі.

Калі на карэкцыйных занятках у настаўніка-дэфектолага Вікторыі Віктараўны Агеевай гучна, то гэта значыць, што патрэбны эфект дасягнуты. Праз мікрафон, узмацняльнік гуку і навушнікі дзеці вучацца развіваць вуснае маўленне і гукавое ўспрыманне. У пяцікласніцы Алісы Васьковіч, якая жыве ў інтэрнаце з маленства, значныя поспехі: нягледзячы на артыкуляцыю настаўніцы, дзяўчынка паўтарае сказы слова ў слова! І гэта Вікторыю Віктараўну не можа не радаваць, бо яна, як ніхто, за 25 працоўных гадоў ведае, што з такіх маленькіх перамог будуецца сцяжынка ў шчаслівае жыццё кожнага вучня. Дэфектолаг са стажам з'яўляецца таксама кіраўніком рэсурснага цэнтра па метадычнаму забеспячэнню адукацыйнага працэсу, развіццю творчых здольнасцяў і сацыяльнай адаптацыі дзяцей з парушэннямі слыху, які працуе на базе інтэрната. Сваімі напрацоўкамі педагогі дзеляцца з настаўнікамі з іншых школ, праводзяць кансультацыі для бацькоў. Цесна інтэрнат супрацоўнічае з Віцебскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам, Акадэміяй сувязі, паспяхова развівае міжведамасныя ўзаемаадносіны.

На працягу пятнаццаці гадоў ва ўстанове адукацыі выпускнікі акрамя пасведчання атрымліваюць працоўныя спецыяльнасці. Так, у рамках прадмета «Працоўнае навучанне» хлопцы і дзяўчаты 11-12 класаў могуць за два гады асвоіць спецыяльнасці сталяра і швачкі, прычым, як паказвае практыка, ахвотна асвойваюць швейнае майстэрства і хлопцы. Галоўнае — зацікавіць і натхніць дзяцей, так лічыць настаўнік Таццяна Уладзіміраўна Чарапок, якая больш за 20 гадоў адкрывае сваім выхаванцам дзверы ў швейны свет. Ужо ў 14 гадоў яе вучні ўмеюць ствараць на машынцы простыя рэчы побыту, старэйшыя шыюць пасцельную бялізну, шторы. Ад Цэнтра занятасці і сацыяльнай абароны вучняў працаўладкоўваюць, заводзяць ім працоўныя кніжкі, і за год кожны адпрацоўвае па 10–20 дзён, напрыканцы школы ў кожнага ёсць працоўны стаж і дадатковы заробак. Дзякуючы моцнай тэхнічнай базе, якая створана ў швейнай майстэрні, такую прафесію тут асвойваюць і вучні з іншых устаноў адукацыі горада. Асабліва ганарацца дзеці і іх настаўніцы дасягненнямі школьнага тэатра мод, касцюмы для якога ствараюцца калектыўна. Апошняй перамогай у скарбонцы ўстановы стаў дыплом спецыяльнага моднага паказу «Каляровыя сны», які праходзіў у Мінску. Ёсць у інтэрнаце і кулінарная майстэрня, каб выхаванцы вучыліся абслугоўваць сябе ў побыце, і ўтульная гасцёўня, дзе адной вялікай сям'ёй сустракаюць святы і дні нараджэння.

У сталярнай майстэрні сярод безлічы станкоў і дрэваапрацоўчых прылад нас сустракае Іна Юр'еўна Панічэўская. Яна працуе ў інтэрнаце з 1995 года. Навучае дзяцей усім этапам дрэваапрацоўкі, стварае з імі творы мастацтва, якія не аднойчы станавіліся прызёрамі абласных конкурсаў. «Нашы дзеці ўмеюць працаваць на любым станку, з любым электраінструментам. Некаторыя так захапляюцца сталярным рамяством, што звязваюць з гэтай галіной прафесію. Вучу выхаванцаў беражлівасці, заўсёды падкрэсліваю, што кожны з іх — мастак», — дзеліцца прынцыпамі работы Іна Юр'еўна.

Вялікае значэнне ў інтэрнаце надаюць спартыўнай падрыхтоўцы. Гэта, прызнаецца кіраўнік фізічнага выхавання Уладзімір Сяргеевіч Палчанінаў, не заўсёды проста: трэба пільна сачыць за нагрузкамі ў залежнасці ад дыягназу дзяцей, накіроўваць звышактыўнасць у карыснае рэчышча. На базе школы рэгулярна праводзяцца таварыскія матчы і спаборніцтвы з вучнямі 26-й школы, студэнтамі ВДУ, часта выхаванцы выязджаюць у іншыя ўстановы. «Гэта не толькі фізічная загартаванасць, але і карысны абмен вопытам. Нашы вучні з асаблівасцямі здароўя камфортна адчуваюць сябе з аднагодкамі, кожны раз пацвярджаючы, што яны такія ж, як і ўсе», — расказвае Уладзімір Сяргеевіч. За 18 гадоў работы з-пад яго трэнерскай рукі выйшлі вядомыя спартсмены: дэфалімпійская чэмпіёнка Каця Белая, лёгкаатлет, чэмпіён Еўропы Данііл Дзігалевіч і іншыя. Сёння ў інтэрнаце, акрамя спартыўнай, ёсць дзве трэнажорныя залы, мноства спартыўнага інвентару і вера ў тое, што пэўныя складанасці ў жыцці толькі загартоўваюць на шляху да вяршыняў.

З улікам таго, што большасць дзяцей знаходзіцца ў інтэрнаце кругласутачна, на базе ўстановы створаны цэлы медыцынскі блок, дзе працуюць свае ўрачы: неўролаг, артапед, педыятр. У залежнасці ад захворвання навучэнцы наведваюць масаж, электра- і святлолячэнне, атрымліваюць прышчэпкі і неабходную медыцынскую дапамогу нават ноччу.

Патрыятычнае выхаванне — яшчэ адна неад'емная частка адукацыйнага працэсу. У 1941 годзе падчас Вялікай Айчыннай вайны побач з будынкам школы-інтэрната размяшчаўся канцлагер для афіцэраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі. Напамінам аб тых ваенных падзеях сёння з'яўляецца камень, які былы дырэктар установы перанёс з балоцістай мясцовасці на тэрыторыю школы. Штогод навучэнцы ў Дзень Перамогі ўскладаюць да яго кветкі і сустракаюцца з дачкой Бацькі Міная Зінаідай Шмыровай, якая даўно сябруе з інтэрнатам. Тым больш, што і вуліца, на якой размяшчаецца ўстанова адукацыі, носіць імя легендарнага камбрыга.

## ТОЛЬКІ РАЗАМ

У школе-інтэрнаце створаны ўсе ўмовы, каб кожны з выхаванцаў адчуваў сябе як дома. Вясной адной вялікай сям'ёй дзеці пад кіраўніцтвам педагогаў апрацоўваюць невялікі гародчык, на якім летась вырасцілі нават гарбузы. Разам радуюцца поспехам і змагаюцца з няўдачамі, разам адзначаюць святы, нават для пяці выхаванцаў-сірот, якія ў навагоднюю ноч застаюцца ў школе, педагогі ствараюць сапраўдную казку з ёлкай, падарункамі і прысмакамі. Таму што дзяцінства, у незалежнасці ад жыццёвых абставін, павінна быць шчаслівым у кожнага маленькага жыхара гэтай планеты. І дарослыя павінны зрабіць для гэтага ўсё магчымае.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

Радзімазнаўства

# НА ВІЦЕБШЧЫНЕ — НА АКАДЭМІЧНЫМ УЗРОЎНІ

**Сярод іншых традыцый асветніцтва, выхаваўчай працы ў грамадстве далёка не апошнюю ролю іграе краязнаўства. Гэта цудоўна разумеюць і ў Віцебскай вобласці. Вось і напрыканцы года ў абласным цэнтры прайшла IX навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край». Гэтым разам яна прысвечана 85-годдзю ўтварэння Віцебскай вобласці. Арганізатары канферэнцыі — Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Віцебскі абласны краязнаўчы музей.**

З прывітальнымі словамі да канферэнцыі звярнуліся старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў, начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Пётр Падгурскі, дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі Таццяна Адамян, дырэктар Інстытута гісторыі НАНБ кандыдат гістарычных навук Вадзім Лакіза, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. На канферэнцыю было прадстаўлена 100 (!) дакладаў. Уражлівы абсяг працы, скіраванай на паглыбленае вывучэнне гісторыі ўсяго адной вобласці нашай краіны. Сярод аўтараў дакладаў — акадэмічныя гісторыкі, універсітэцкія выкладчыкі, музейныя работнікі, журналісты, кіраўнікі грамадскіх школьных музеяў...

— Мы вельмі ўважліва ставімся да традыцыі правядзення канферэнцый «Віцебскі край», — каментуе падзею дырэктар абласной бібліятэкі Таццяна Адамян. — Гэтая работа стала складнікам Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021—2025 гады «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы». Мы вельмі ўдзячны за падтрымку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Супрацоўнікі акадэмічнага Інстытута гісторыі на чале з дырэктарам Вадзімам Лакізам падрыхтавалі самыя грунтоўныя даклады, звярнуліся да няпростых тэм, звязаных з Віцебшчынай. У рамках канферэнцыі разгледжаны і тэмы, прапанаваныя расійскімі даследчыкамі. Як прыклад — «Помнікі Айчыннай вайны 1812 года на Віцебскай зямлі» Вадзіма Гаўрылава з Масквы, «Маёнтак Лукішкі і яго апошні ўладальнік Пётр Косаў» Вадзіма Сядова... Прыемна, што знайшлося шмат руплiўцаў, якія аглядаюць блізкую да нас гісторыю. Святлана Дзядзінкіна звярнулася да тэмы краязнаўчай экспедыцыі «Заходняя Дзвіна — 98», старшыня Віцебскага аблсавета Уладзімір Цярэнцьеў падрыхтаваў даклад «Рэалізацыя канцэпцыі шматнацыянальнага савецкага народа ў сферы культуры ў 1965—1985 гг. на прыкладзе Віцебскай вобласці». Алеся Багданава разгледзела пытанне міжнароднага турызму ў БССР у другой палове XX стагоддзя. Шмат увагі да тэмы падзей Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне. Прыемна, што сярод удзельнікаў канферэнцыі — і навуковая моладзь, студэнцтва.

Дзявятая па ліку канферэнцыя гісторыкаў і краязнаўцаў, якім асабліва цікавая Віцебшчына, завяршылася. Наперадзе — падрыхтоўка да дзясятай, юбілейнай, на якой, несумненна, галоўнай стане тэма ваеннай гісторыі Беларусі і Віцебскай вобласці. У 2024 годзе і вобласць, і ўся наша краіна адзначаюць 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І, канешне ж, многія даклады будуць прысвечаны самым розным аспектам ваеннай тэмы. Да вывучэння Вялікай Айчыннай вайны ў звязку з родным рэгіёнам і скіравана цяпер асноўная праца аддзела краязнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# КАКАВАВЭЛА І ВІНАГРАДНЫЯ ЖАМЕРЫНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Блендар сёння ёсць, напэўна, у кожным доме, ды і купіць «касмічнае харчаванне» ў цюбіках — не праблема, яно прадаецца ну хоць бы на OZON (каштуе ў сярэднім 20 рублёў за цюбік). Але гастранамічныя трэнды будучыні з ім ніяк не звязаны. Будучыня ўвогуле аказалася і прасцейшая, і складанейшая, чым уяўлялі фантасты, якімі мы зачытваліся ў савецкім дзяцінстве. Да далёкіх планет чалавецтва так і не даляцела, засталося дома, і, з улікам росту працягласці жыцця і павелічэння насельніцтва Зямлі, воляй-няволяй прыйшлося задумацца аб канечнасці рэсурсаў гэтага самага дома. Даныя Сусветнай харчовай праграмы ААН змяшчаюць такую лічбу: сёння ў свеце 795 000 000 тых, хто галадае. Пры гэтым, паводле прыведзеных там жа звестак, у цэлым у краінах, дзе з харчовай бяспекай усё ў парадку (а ў гэты лік уваходзіць і наша краіна), прыкладна трэць поўнасцю прыдатных да ўжывання харчовых рэсурсаў адпраўляецца ў смецевыя бакі. Сёння панацэя «харчовая бяспека» ва ўсіх на слыху. І адзін з яе важных аспектаў — барацьба з бяздумным расходам харчовых рэсурсаў і лішкамі харчовых адходаў. Паводле прагнозаў футуролагаў, адзін з галоўных трэндаў будучыні — беражлівае стаўленне да прадуктаў харчавання. У тым ліку выкарыстанне для вытворчасці харчавання не толькі зыходнай сыравіны, але і прамежкавых прадуктаў тэхналагічнага цыкла, якія сёння прынята лічыць адходамі вытворчасці.

## Для спартсменаў і аматараў здаровага харчавання

«Адходы ў даходы» — у апошнія гады адзін з ключавых кірункаў даследаванняў НПЦ па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. І пэўныя вынікі ўжо можа ацаніць спажывец. «Першай ластаўкай» стала малочная сыроватка, якая да нядаўняга часу ўтылізавалася — па сутнасці, проста вылівалася, што наносіла, да таго ж, шкоду экалогіі. Між тым прадукт гэта ўнікальны: утрымлівае каля 200 карысных для нашага арганізма рэчываў. Сыроватка багатая на вітаміны: A, E, C, групы B (у тым ліку рэдкія формы вітамінаў $B_7$ і $B_4$). Паляпшае работу мозгу і памяць, з'яўляецца крыніцай кальцыю (сутачную дозу кальцыю змяшчае літр малочнай сыроваткі) і калію, выводзіць таксіны, паляпшае работу наднырачнікаў і змяншае выпрацоўку гармонаў стрэсу.

— Сёння ў Беларусі перапрацоўваецца практычна 100 % сыроваткі (98,5 %, калі казаць дакладна), — адзначае **генеральны дырэктар РУП «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па харчаванні» Аляксей МЕЛЯШЧЭНЯ.** — Гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у свеце.

— Працягвае расці сусветны рынак прадуктаў з сыроваткі па прычыне яе пажыўнай каштоўнасці і ўніверсальнасці ў выкарыстанні (у сумесях для дзіцячага харчавання, спартыўнага харчавання і г. д.), — распавядае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Навукова-вытворчага прадпрыемства «Інстытут мяса-малочнай прамысловасці» Алена СЦЯПАНАВА.** — У нашай краіне сёння малочная сыроватка перапрацоўваецца па розных тэхналогіях на натуральнамалочныя, кісламалочныя, бялковыя, згушчаныя і сухія прадукты. Падсырная сыроватка выкарыстоўваецца ў якасці асноўнай сыравіны для вытворчасці пастэрызаваных напояў з дабаўленнем сокаў, сквашаных напояў з павышаным утрыманнем бялку, альбуміназмяшчальнага прадукту — сыру тыпу «Рыкота», згушчаных прадуктаў на аснове малочнай сыроваткі гідралізаванай дэмінералізаванай.

Акрамя таго, усе віды сыроваткі перапрацоўваюцца на сухія прадукты, дадала спецыяліст.

## Новыя кармы для жывёлагадоўлі

Будучыня харчовай сферы звязана са шматлікімі інавацыямі ў мяса-малочнай галіне, адзначаюць у сваіх прагнозах аналітыкі. Масавая вытворчасць «мяса з прабіркі» — пакуль дастаткова далёкая перспектыва. Але вось кармы з другаснай сыравіны — ужо не заўтрашні, а практычна сённяшні дзень. Так, у нашай краіне ў найбліжэйшы час будзе рэалізаваны праект па перапрацоўцы спіртавой брагі ў каштоўныя кармавыя прадукты для буйной рагатай жывёлы, свіней, сельскагаспадарчай птушкі.

— Сумесна з ААТ «Мінск Крышталь» арганізоўваем вытворчасць па перапрацоўцы брагі, — распавядае **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце РУП «НПЦ НАН па харчаванні» Дзмітрый ЗАЙЧАНКА.** — Гэты прадукт сёння варта разглядаць не як адход, а як другасны рэсурс для вытворчасці каштоўных кармавых прадуктаў новага пакалення тыпу DDGS. Паводле тэхналогіі, пры вытворчасці спірту збожжа здрабняецца і апрацоўваецца высокаэфектыўнымі ферментамі так, каб крухмалістыя рэчывы ператварыліся ў прасцейшыя монацукрыды і дыцукрыды, якія можа засвойваць дражджавая клетка. Падрыхтаванае сусла адпраўляецца на дражджавое браджэнне, у выніку якога мы атрымліваем напрыканцы спірт і брагу. У бразе няма спірту, затое ёсць каштоўны бялок, азоцістыя рэчывы, карысныя буйной рагатай жывёле, іншай сельскагаспадарчай жывёле і птушцы. Тэхналогія, якую хоча ўкараніць «Мінск Крышталь», дазволіць выпрацоўваць сухі, багаты пажыўнымі рэчывамі, кармавы прадукт, прычым дастаткова дарагі і з экспартным патэнцыялам. І яшчэ адзін плюс — для экалогіі: ператвараючы адходы ў даходы, мы да таго ж не забруджваем навакольнае асяроддзе.

Аб перапрацоўцы прамежкавых прадуктаў вытворчасці ў сферы харчавання гаварылі даўно, але актыўна ўвасабляцца ў жыццё ідэя стала толькі ў апошнія гады.

— Удасканаліліся тэхналогіі. Акрамя таго, падзеі апошніх гадоў навучылі і людзей, і дзяржавы лічыць грошы, — гаворыць навуковец. — Людзі нарэшце сталі больш уважліва ставіцца да пытанняў экалогіі. Калі казаць пра Беларусь, то мы — не такая ўжо вялікая краіна, пры гэтым аб'ёмы вытворчасці прадуктаў харчавання ў нас пастаянна нарошчваюцца: адзін з нашых экспартных патэнцыялаў — прадукты харчавання. І таму важна перапрацоўваць другасныя рэсурсы: мы атрымліваем з аднаго боку імпартазамяшчэнне, з другога — прадукты з высокім экспартным патэнцыялам (у прыватнасці кармавыя). Навошта выкарыстоўваць у якасці кармавой базы, напрыклад, зерне, калі неабходныя карысныя сельскагаспадарчых жывёл рэчывы можна атрымаць з прамежкавых прадуктаў? Напрыклад, у бразе, пра якую мы гаварылі, дастаткова высокае ўтрыманне бялку (да 45 % у залежнасці ад віду перапрацоўкі) за кошт дражджавой біямасы. І гэта забяспечыць той высокі працэнт бялку ў малацэ, які сёння патрабуецца ад вытворцы.

Новая вытворчасць на «Мінск Крышталь» павінна пачаць работу прыкладна праз два гады, адзначыў субяседнік. Яшчэ адзін праект для жывёлагадоўлі — сумесны з ААТ «Белсолад».

— Ён звязаны з вытворчасцю грануляваных камбікармоў з адходаў соладавай вытворчасці, — распавёў Дзмітрый Зайчанка. — Мы прыступілі да распрацоўкі тэхналогій. Пакуль прадпрыемствы вырабляюць з гэтай другаснай сыравіны простыя кармавыя монапрадукты, але больш перспектыўна пачаць вытворчасць складаных кармавых прадуктаў, больш каштоўных і дарагіх.

## Ідэі будучыні

Словазлучэнне «адходы вытворчасці» навукоўцы не ўжываюць.

— Мы аддаём перавагу тэрміну «другасны сыравінны рэсурс», — падкрэслівае Дзмітрый Зайчанка. — Ёсць ідэя — мы агучвалі яе на нядаўняй выставе «Прадэкспа» — па перапрацоўцы какававэлы. Гэта цікавы праект, якім мы будзем займацца ў найбліжэйшай перспектыве.

Какававэла — пабочны прадукт вытворчасці шакаладу: абалонка какава-бабоў, якая змяшчае мноства каштоўных рэчываў. Сёння з яе вырабляюць толькі брэкеты, якія выкарыстоўваюцца ў якасці паліва, расказаў вучоны, але пры правільнай апрацоўцы яна можа стаць каштоўным харчовым рэсурсам, крыніцай мікраэлементаў і карыснай для стрававання клятчаткі, а таксама натуральным араматызатарам у кандытарскай прамысловасці. Але пакуль яе перапрацоўка патрабуе шэрагу тэхналагічных рашэнняў.

— Дастатковая ступень драбнення какававэлы прыводзіць да павышэння зносу абсталявання, плюс неабходна вырашыць пытанне мікрабіялагічнай бяспекі прадукту, — распавядае Дзмітрый Зайчанка. — Але ў гэтай ідэі ёсць патэнцыял. На сусветным рынку сёння прадстаўлены разнастайныя прадукты для правільнага харчавання на аснове какававэлы, і яны карыстаюцца папулярнасцю. Для нашай харчовай прамысловасці гэта пакуль ідэя будучыні, але мы спадзяёмся, найбліжэйшай.

Ідэя найбліжэйшай будучыні — і выкарыстанне другаснага прадукту вінаробства, вінаградныя жамерыны.



— Распрацавана тэхналогія апрацоўкі жамерын, якая дазваляе дадаткова экстрагаваць карысныя рэчывы і ў далейшым выкарыстоўваць гэты прамежкавы прадукт у вінаробстве, — адзначае суразмоўца. — Ёсць і яшчэ адна ідэя, пакуль да стадыі прыкладных распрацовак яна не дайшла: выкарыстанне тых жа жамерын, вінаградных і яблычных, для прымянення ў кандытарскай сферы. Складанасць тут у тым, што прадукт гэты хутка псуецца, яго неабходна перапрацоўваць на працягу некалькіх гадзін. Але высушванне, як від кансервацыі, патрабуе ад прадпрыемства дадатковых затрат электраэнергіі — такім чынам, на сёння гэта не заўсёды выгадна. Пакуль гэтыя выціскані проста адгружаюцца навакольным гаспадаркам на корм жывёле. Але наогул гэта каштоўны рэсурс — вітаміны, мікраэлементы, клятчатка. І сёння мы займаемся, пакуль у лабараторных умовах, распрацоўкай энергаэфектыўных тэхналогій для вытворчасці прадуктаў харчавання на яго аснове.

Цікавасць навукоўцаў звязана таксама з такім прамежкавым прадуктам вытворчасці бульбяного крухмалу, як сухая мязга.

— У краіне выпускаюцца крухмалы высокай якасці, якія карыстаюцца попытам і за межамі Беларусі, таму што гэта натуральны прадукт: нашы прадпрыемствы не выкарыстоўваюць адбельвальныя кампаненты, дасягаючы белага колеру крухмалу за кошт класічных экалагічных тэхналогій. Адзін з пабочных прадуктаў такой вытворчасці — бульбяная мязга, то-бок цёртая бульба без крухмалу. Дарэчы, пасля сушкі маса змяшчае да 50 % крухмалу ў сухім рэчыве. Гэта той крухмал, які ўжо немагчыма вылучыць з сыравіны, і ён — каштоўны пажыўны вуглявод. Гэта добры напаўняльнік, напрыклад, у каўбасныя вырабы, як вільгацеўтрымальны кампанент, прымяняецца ў шэрагу іншых харчовых вытворчасцяў, прадукт мае і патэнцыял выкарыстання ў жывёлагадоўлі. У нас ужо ёсць пэўныя напрацоўкі ў гэтай галіне. Але зноў жа, як і з любымі другаснымі рэсурсамі, важна зрабіць максімальна таннымі тэхналогіі іх перапрацоўкі.

## На перспектыву

Праект на больш далёкую перспектыву звязаны з другаснымі сыравіннымі рэсурсамі пры вытворчасці цукру.

— Адпрацоўваючы тэхналогіі павышэння выхаду цукру, мы таксама падыходзім цяпер да распрацоўкі тэхналогіі вытворчасці з меласы (адходу цукровай вытворчасці) такога кармавога прадукту, як бетаін. Гэта карысны элемент для харчавання сельскагаспадарчых жывёл — паскарае рост, умацоўвае імунітэт, павышае засваяльнасць ежы, і сёння ён імпартуецца. Пакуль мы на стадыі даследавання, таму што гэта даволі дарагія тэхналогіі. У цукровых бураках працэнт бетаіну не вельмі высокі, але калі глядзець у цэлым па галіне, можна атрымаць даволі вялікія аб'ёмы і закрыць большую частку імпарту.

Не пад кожны з праектаў навукоўцаў давядзецца будаваць новую вытворчую лінію (або нават новае прадпрыемства), падкрэслівае суразмоўнік.

— Па асобных праектах мы імкнёмся распрацоўваць тэхналогіі на тых лініях, якія ёсць на прадпрыемствах. Але, сапраўды, як у выпадку з «Крышталём», шэраг праектаў запатрабуе ад прадпрыемстваў дадатковага абсталявання. Калі казаць аб тых жа кармавых прадуктах (гэтыя распрацоўкі ў сувязі з хуткім развіццём жывёлагадоўлі зараз у прыярытэце), то калі раней адходы харчовай вытворчасці наўпрост накіроўваліся на корм жывёлам, цяпер гэты другасны рэсурс трэба дадаткова апрацаваць, правесці шэраг тэхналагічных аперацый, каб атрымаць канчатковы прадукт. Але прадукт больш каштоўны і, што немалаважна, з вялікім тэрмінам прыдатнасці. А значыць, яго можна перавозіць на вялікія адлегласці і лёгка захоўваць. Такім чынам, і працэнт зацікаўленасці гаспадарак па ўсёй краіне (а не толькі ў радыусе некалькіх дзясяткаў кіламетраў ад прадпрыемства) будзе вышэйшы, і прадукт можна будзе рэалізоўваць за межы Беларусі. А значыць, учарашнія адходы ператворацца ў важны рэзерв імпартазамяшчэння і экспарту.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Сінема

# АД БАСАНОВЫ ДА ТРЫЛЕРА

## У Мінску пасля дзесяцігадовага перапынку праходзіць фестываль бразільскага кіно



**Трэці фестываль бразільскага кіно праходзіць у Мінску. Паказы праводзяцца ў сталічным кінатэатры «Піянер».**

— Пасля мінулага фестывалю прайшло дзесяць гадоў. Складана было б выбраць лепшы момант для прадаўжэння цудоўнай традыцыі, паколькі апошнім часам у Беларусі павялічваецца цікавасць да Бразіліі, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця фестывалю **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Рэспубліцы Беларусь Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія КЛІНГЛ.** — Мастацтва з'яўляецца магутным інструментам для паглыблення ў культуру краіны, а кінематограф — важным каталізатарам для разумення такой шматграннай краіны, як Бразілія.

**Дырэктар кампаніі Linhas Producoes Culturais Фернанда БУЛЬЁЭС** анансавала разнастайную праграму фестывалю бразільскага кіно.

— Апошнім часам бразільскі кінематограф быў адзначаны прызамі на такіх уплывовых пляцоўках, як Венецыянскі, Канскі і Берлінскі кінафестывалі, — заўважыла Фернанда Бульёэс. — У Мінску прадстаўлена падборка з пяці карцін, дзякуючы якім ёсць магчымасць не толькі пазнаёміцца з нашай культурай, але і дакрануцца да штодзённага жыцця бразільцаў, адчуць нашы эмоцыі. У гэтым вялікая моц і магія кіно. Кіно — гэта капсула часу, якая запячатвае рэчаіснасць.

Адкрыў кінафестываль дакументальны фільм «Эліс і Том — гэта павінна было здарыцца толькі з табой» (2023 год). Карціна апавядае аб супрацоўніцтве двух музычных геніяў XX стагоддзя: дырыжора, кампазітара і аўтара сусветна вядомай песні «Дзяўчына з Іпанэмы» Тома Жобіма і вялікай бразільскай спявачкі Эліс Рэжыны. У кінастужцы расказваецца аб стварэнні аднаго з самых вядомых у свеце музычных альбомаў. Фільм дазваляе зазірнуць за кулісы запісу гэтага альбома ў лютым 1974 года ў Лос-Анджэлесе, які зменіць жыццё кампазітара і спявачкі і стане знакавым творам не толькі бразільскай, але і сусветнай музыкі.

— Я сапраўдны фанат басановы, — прызнаўся Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. — Гэта насамрэч тая музыка, глабальная культурная з'ява, якая адметна прадставіла Бразілію ўсяму свету. Як гэта ні дзіўна прагучыць, у карціны шмат сувязяў з вашай краінай. Беларусы — людзі з тонкай, адчувальнай душой. Таму я проста ўпэўнены, што ў вас не толькі шмат прыхільнікаў басановы, а і тых, хто з радасцю да іх далучыцца.

І насамрэч нам вельмі цікава было апынуцца на творчай кухні, дзе амаль паўстагоддзя таму нараджаўся выдатны альбом «Elis&Tom», які па праве трапіў у скарбонку сусветнай класікі. Між тым музычная тэма будзе мець свой працяг. На бразільскім кінафестывалі таксама будзе паказаны біяграфічны фільм «Пішынгінья». Карціна апавядае пра Алфрэда да Роша Віяна Фільё, які лічыцца адным з самых любімых артыстаў Бразіліі мінулага стагоддзя. Біяграфічная стужка прыадкрые малавядомыя старонкі яго жыцця і творчасці, непарыўна звязаныя з народнымі матывамі шора (жанр бразільскай народнай музыкі).

Яшчэ адзін фестывальны фільм — рамантычная камедыя «Эдуарда і Моніка» рэжысёра Рэнэ Сампаё. Гэта гісторыя кахання паводле аднайменнай песні рок-гурта Legiao Urbana, які завяваў не адно пакаленне слухачоў. Фільм пад назвай «Пурэза» — біяграфічная драма, якая знята рэжысёрам Рэната Барбіеры. Кінастужка была ўдастоена шматлікіх нацыянальных і міжнародных узнагарод.

Трылер «Розная праўда» створаны Жазэ Эдуарда Белмонтэ. Расследуючы замах у аддаленым рэгіёне на паўночным усходзе Бразіліі, паліцэйскі Жазуэ сутыкаецца з няпростым выбарам. Чыёй версіі падзей паверыць — паказанням наёмнага забойцы, меркаванню таго, хто выжыў або аповеду яго нявесты? Тры гісторыі аднаго злачынства. Якая з іх акажацца сапраўднай?..

Мінск становіцца кінематаграфічнай сталіцай — пасля завяршэння «Лістапада» да нас завітаў фэст бразільскага кіно. Пра культуру далёкай па адлегласці, але такой блізкай па духу заакіянскай краіны можна шмат расказваць, аднак лепш усё пабачыць на ўласныя вочы. Яшчэ ёсць такая магчымасць. А на кантрасце з цяперашнімі завеямі дык і ўвогуле — шыкоўнае відовішча.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гомельоблсервис» (продавец) извещает о проведении 5 января 2024 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2.9**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условия продажи: 1)** возместить продавцу затраты, понесенные на изготовление необходимой документации, связанной с подготовкой недвижимого имущества к отчуждению, не позднее 10 календарных дней со дня реализации; **2)** срок выполнения работ по текущему или капитальному ремонту недвижимого имущества с благоустройством прилегающей территории не более шести месяцев с даты заключения договора купли- продажи; **3)** срок разработки проектной документации не более восемнадцати месяцев с даты заключения договора купли-продажи, срок начала реконструкции приобретенного имущества в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации и срок ее окончания – нормативный срок согласно разработанной и утвержденной проектной документации. За неисполнение обязательств, предусмотренных договором купли-продажи, покупатель уплачивает штраф в размере 50 процентов от цены продажи недвижимого имущества. В течение одного года после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа покупатель устраняет допущенные нарушения. Неисполнение обязательных условий продажи по истечении одного года после уплаты либо поступления первого платежа в счет уплаты указанного штрафа, а также неуплата указанного штрафа являются основанием для расторжения договора купли-продажи по соглашению сторон либо по решению суда. При расторжении договора купли-продажи недвижимое имущество возвращается продавцу, в том числе с учетом выполненных покупателем неотделимых улучшений, без возмещения их стоимости, без возврата покупателю денежных средств, уплаченных им за недвижимое имущество | | | |
| 1 | - Капитальное строение, инв. № 350/С-49004 общей площадью 363,6 кв. м (составные части и принадлежности: рампа, крыльцо), наименование: склад, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Богдана Хмельницкого, 77Е/1.<br>- Капитальное строение, инв. № 350/С-49006 общей площадью 1256,8 кв. м (составные части и принадлежности: склад, пристройка), наименование: склад, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Богдана Хмельницкого, 77Е.<br>**Информация о земельном участке:** расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000006006426 площадью 0,3364 га | 720 000,00 | 144 000,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблсервис», 246017, г. Гомель, ул. Катунина, 14.

Порядок ознакомления с имуществом для осмотра: главный инженер Тимошенко Андрей Иванович, +375 29 655 83 02, для заключения договора купли-продажи: главный бухгалтер Быковская Ольга Эдуардовна, +375 29 328 36 47.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет Продавца торгов ОАО «Гомельоблсервис»: р/с № BY81BLBB30120400071217001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 400071217, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 02 декабря 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. 2.9 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 03 января 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты в рассрочку на три месяца:**

- первый платеж – 50 % стоимости за вычетом задатка торгов не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи;
- второй платеж – 25 % стоимости за вычетом задатка торгов не позднее 40 (сорока) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи;
- третий платеж – 25 % стоимости за вычетом задатка торгов не позднее 70 (семидесяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества**

**ОАО «Могилевхимволокно»**

**Аукцион состоится 20.12.2023 в 14.00**
по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

Лот № 1 **– капитальное строение с инв. 700/С-50159 – здание административного корпуса № 3 отдел кадров**, пл. – 2496,0 кв. м, назначение: здание административно-хозяйственное, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000001001312 (пл. 44,2606 га, право постоянного пользования, отдельный земельный участок для обслуживания здания не выделен), по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта.

**Капитальное строение с инв. 700/С-50121 – здание проходной на ЗПН-2**, пл. – 15,2 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 740100000005001828 (пл. 221,2366 га, право постоянного пользования, отдельный земельный участок для обслуживания здания не выделен), по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пр-т Шмидта, 45.

**Ограждение возле АБК-3 из металлических прутьев**, р. 34.8*0.9 (инв. № по бух. учету 2030081900). **Локальная вычислительная сеть АИК-3** (инв. № по бух. учету 4800545100). **Система охранной сигнализации в инженерно-административном корпусе № 3** (инв. № по бух. учету 4701454200). **Участок ливневой канализации от магистрали до АБК-3** (инв. № по бух. учету 30101216000). **Кабель телефонный ТПП 50*2*0,5 (возле ОК)** (инв. № по бух. учету 3000093800). **Кабель телефонный ТПП 100*2*0,5 (возле ОК)** (инв. № по бух. учету 3000093900). **Кабель телефонный ТПП 20*2*0,5 (возле ОК)** (инв. № по бух. учету 3000094000). **Кабель телефонный ТПП 10*2*0,5 (возле ОК)** (инв. № по бух. учету 3000094100). **Кабель ПРППМ-2 *1,2** (инв. № по бух. учету 3000013200).

**Начальная цена продажи: 836 675,09 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 83 667,51 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 19.12.2023 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 27.05.2023, 22.09.2023.

Доп. информацию можно получить
по **тел. 8 029-624-26-25, Mogilev@ino.by**



**ЗАО «ПАТИО»**
**объявляет об отзыве 1 наименования товара, в связи с признанием их несоответствующими отдельным стандартам Технических регламентов Таможенного союза.**
**А именно: Миксер VITEK VT-1495.**

Для возврата продукции, в зависимости от способа приобретения указанного выше наименования, Вы можете обратиться:

- В розничный магазин «5 элемент», в котором была совершена покупка. При себе необходимо иметь товар, чек, гарантийный талон.
- В интернет-магазин 5element.by по телефону 275 (единый мобильный номер) или (018) 359-59-59 (городской номер).

УНП 100183195

## Прэм'ера рубрыкі

У перыяд вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў з верасня 1943 года да ліпеня 1944 года савецкімі войскамі на тэрыторыі рэспублікі былі праведзены наступныя аперацыі: бітва за Днепр (верасень — снежань 1943 г.), Гарадоцкая (13—31 снежня 1943 г.), Калінкавіцка-Мазырская (8 студзеня — 8 лютага 1944 г.), Рагачоўска-Жлобінская (21—26 лютага 1944 г.) і Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» (23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.). Аб асаблівасцях гэтых баёў, у ходзе якіх была вызвалена наша краіна, прапануем даведацца ў цыкле публікацый, прысвечаных тагачасным падзеям. Раскажам і аб героях бітваў за Беларусь, імёны якіх упісаны не толькі ў айчынную, але і ў сусветную гісторыю. Некаторыя з легендарных асоб, якія ўнеслі асабісты ўклад у вызваленне БССР, з'яўляюцца незаслужана забытымі. Паспрабуем выправіць гэтую сітуацыю.

Баі за Беларусь

# БІТВА ЗА ДНЕПР

**Пачатак вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у верасні 1943 года паклала бітва за Днепр. Яе састаўной часткай была Гомельска-Рэчыцкая аперацыя, якая праводзілася з 10 да 30 лістапада.**

## Адпачыць і адсядзецца не атрымалася

Пацярпеўшы поўнае паражэнне ў Курскай бітве, страціўшы летам 1943 года мноства танкаў і самалётаў, гітлераўскае камандаванне ратавала свае войскі адступленнем за Днепр. Не пусціць савецкіх ваеннаслужачых за гэтую раку — такую клятву падпісвалі нямецкія салдаты. Так Гітлер і яго генералы спадзяваліся перадыхнуць, каб набрацца сіл і спыніць Чырвоную Армію.



Помнік воінам-вызваліцелям у Камарыне.

11 жніўня 1943 года Гітлер аддаў загад аб неадкладным будаўніцтве «Усходняга вала» — стратэгічнага абарончага рубяжа на рацэ Нарва, каля Пскова, Віцебска і Оршы, на рацэ Сож, сярэднім цячэнні Дняпра і рацэ Малочнай. Галоўнай часткай гэтага вала з'яўляліся абарончыя збудаванні па Дняпры. Днепр, шырокі і глыбокі, а яшчэ з яго высокім правым берагам, уяўляў сур'ёзную перашкоду для войскаў, што наступалі. Па меркаванні нямецкага камандавання, ён павінен быў стаць непераадольным бар'ерам для Чырвонай Арміі. «Хутчэй Днепр пацячэ назад, чым рускія пераадолеюць яго», — выхваляючыся, заяўляў Гітлер на адной з нарад у Берліне. Высокі ды яшчэ абрывісты правы бераг ворагі нядрэнна ўмацавалі. Для большай устойлівасці былі створаны ўмацаванні і на левым, супрацьлеглым, беразе.

Акупанты цешылі сябе надзеяй, што змогуць адпачыць, адсядзецца за «Усходнім валам». Аб гэтым адкрыта казаў камандзір 47-га танкавага корпуса вермахта генерал Форман. «Мы спадзяваліся на абарону і бяспеку за Дняпром, — казаў ён. — Адзіны сэнс ва ўсіх цяжкіх баях, якія мы вялі ў апошнія месяцы, быў адзін — пераправіцца праз Днепр і там, нарэшце, знайсці спакой». Нямецкае камандаванне лічыла, што для падрыхтоўкі да фарсіравання Дняпра рускім спатрэбіцца, як мінімум, месяц. Генералам вермахта і ў галаву не магло прыйсці, што савецкія войскі пасля грандыёзнай Курскай бітвы, якая патрабавала ад іх каласальнага напружання, а затым новага цяжкага наступлення, выйшаўшы да Дняпра, кінуцца з ходу фарсіраваць такую сур'ёзную перашкоду. Прычым на спадручных сродках: бярвёнах, невялікіх плытах і рыбацкіх лодках.

Першым раённым цэнтрам Беларусі, вызваленым ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, стаў раённы цэнтр Камарын (цяпер гарадскі пасёлак, знаходзіцца ў Брагінскім раёне Гомельскай вобласці). У ноч з 22 на 23 верасня 1943 года першымі на беларускую зямлю ступілі войскі 13-й арміі Цэнтральнага фронту. Штаб гэтай арміі ўзначальваў беларус Аляксандр Петрушэўскі. Да канца дня 23 верасня 13-я армія захапіла плацдарм у 25 кіламетраў па фронце, ад двух да дзесяці кіламетраў углыб, і выйшла на рубеж Мнева — Верхнія Жары — вусце Прыпяці. Гэта быў першы — так званы Камарынскі плацдарм — на беларускім Палессі.

## Загінулі героямі

Вялікую ролю ў паспяховым фарсіраванні Дняпра адыграла дырэктыва Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 9 верасня 1943 года. Асаблівая ўвага ў ёй звярталася на фарсіраванне буйных водных перашкод з ходу. Тых, хто найбольш вызначыўся, прадпісвалася прадстаўляць да звання Героя Савецкага Саюза.

За подзвігі, здзейсненыя пры вызваленні Камарына і Камарынскага раёна, 33 воіны 74-й стралковай дывізіі былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Сярод іх — і беларус, камандзір стралковай роты старшы лейтэнант Ігнат Мацкевіч. Яго рота 22 верасня захапіла плацдарм, адбіла пяць контратак праціўніка, пры гэтым камандзір роты асабіста падпаліў два танкі і знішчыў каля паўсотні гітлераўцаў. 26 верасня 1943 года наш зямляк загінуў у баі.

У брацкай магіле ў Камарыне вечным сном спяць 627 воінаў 15-га стралковага корпуса, якія загінулі пры фарсіраванні Дняпра, вызваленні Камарына і найбліжэйшых вёсак. Шасцярым з іх было прысвоена найвышэйшае званне, у прыватнасці ўраджэнцу Іркуцкай вобласці Івану Анціпіну. Удзельнік бітвы пад Арлом, ён зняў і абясшкодзіў 400 мін. Асабліва вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на Камарыншчыне. У ноч на 27 верасня пад моцным агнём праціўніка Анціпін кіраваў пераправай батальёна. Загінуў у баі 6 кастрычніка 1943 года на тэрыторыі Брагінскага раёна.



Брацкая магіла ў Камарыне,
дзе вечным сном спяць 957 ваеннаслужачых,
якія вызвалялі Камарынскі раён.

Пры фарсіраванні Дняпра вызначыўся і ўраджэнец Якуцкі, будучы Герой Савецкага Саюза Фёдар Папоў. 2 кастрычніка пад моцным агнём немцаў у ліку першых ён пераправіўся праз раку, уварваўся ў траншэі ворага, захапіў ручны кулямёт і знішчыў 23 гітлераўцы. На другі дзень з трафейнай зброяй прабраўся ў фланг абароны роты і адбіў контратаку, забіўшы пры гэтым каля 50 варожых салдат. Загінуў у баі 10 кастрычніка 1943 года.

У брацкай магіле пахаваны і наш зямляк, ураджэнец Рагачова Віталь Калеснікаў. Падчас бою ён узначаліў роту, пад агнём праціўніка арганізаваў яе пераправу праз раку, на правым беразе павёў байцоў у штыкавую атаку. Рота прасунулася наперад на шэсць кіламетраў і вызваліла вёску Вялле. Каля вёскі Галкі адбіла некалькі атак праціўніка, сілы якіх пераўзыходзілі ў некалькі разоў. У тых баях Калеснікаў асабіста забіў некалькі дзясяткаў немцаў. Быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вайны служыў у савецкай арміі, у адстаўку выйшаў у званні палкоўніка. Пайшоў з жыцця ў лістападзе 1964 года. У гонар вызваліцеля ў Рагачове ўстаноўлены абеліск, яго імя носіць адна з гарадскіх вуліц.

## Унёсак партызан

Значную дапамогу ў баях за фарсіраванне Дняпра войскам аказвалі савецкія партызаны. Яны выбівалі ворага з участкаў, найбольш зручных для фарсіравання ракі, збіралі сродкі, якія падыходзілі для пераправы, прымалі ўдзел у баях, дапамагалі перапраўляць праз Днепр людзей, баявую тэхніку і боепрыпасы. Ацэньваючы дапамогу савецкіх патрыётаў у баях за Днепр, камандуючы 13-й арміяй генерал Мікалай Пухаў пісаў, што «не было тады ні аднаго чалавека з мясцовага насельніцтва, які не дапамагаў бы нам».

Складаная задача выпала на долю 65-й і 48-й армій, якія, пераправіўшыся праз Дзясну, вялі баі на гомельскім напрамку. Вынарыстоўваючы вялікія лясныя масівы, забалочаныя прасторы і суцэльныя балоты, праціўнік арганізаваў сур'ёзнае супраціўленне. Каб хутчэй пераадолець гэтую паласу, даводзілася напружваць усе намаганні. Гэта войскам удалося толькі да канца верасня, калі яны, гераічна змятаючы гітлераўцаў, амаль адначасова выйшлі да ракі Сож каля Гомеля. У кастрычніку 1943 года, аднавіўшы наступленне, 65-я армія ва ўзаемадзеянні з 61-й арміяй фарсіравала Днепр і захапіла плацдарм на правым беразе ў раёне Лоева. Такім чынам, задача, пастаўленая Стаўкай войскам Цэнтральнага фронту, была выканана. Замацаваўшыся на захопленых плацдармах, на рэках Днепр, Прыпяць і Сож, савецкія салдаты мужна працягвалі барацьбу за іх пашырэнне.

## Ключ да Гомеля

10 кастрычніка 1943 года воіны 73-й стралковай дывізіі, якой камандаваў генерал-маёр Дзмітрый Смірноў, 48-й арміі Цэнтральнага фронту вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Добруш і неўзабаве выйшлі да ракі Сож. 15 кастрычніка 1943 года пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі і ўдараў авіяцыі войскі 65-й арміі (камандуючы — генерал-лейтэнант Павел Батаў) Цэнтральнага фронту пачалі фарсіраванне Дняпра на 20-кіламетровым участку на поўдзень ад гарадскога пасёлка Лоеў Гомельскай вобласці. Практычна за месяц з часу выхаду савецкіх войскаў да Дняпра гітлераўцы паспелі тут грунтоўна ўмацавацца. Яны ўсведамлялі, што Лоеў, размешчаны пры зліцці Дняпра і Сожа, — гэта, па вялікім рахунку, ключ да Гомеля. Ад Лоева савецкія войскі маглі развіваць наступленне непасрэдна ў тыл праціўніка.

У баях на Лоеўскім плацдарме асабліва вызначыліся войскі 65-й і 61-й армій, якімі адпаведна камандавалі Павел Батаў і Павел Бялоў. За пяць дзён упартых наступальных баёў яны прарвалі абарону праціўніка і завалодалі плацдармам у 20 кіламетраў у глыбіню і 13 кіламетраў па фронце. Нягледзячы на супраціўленне ворага, воіны фарсіравалі Днепр, авалодалі моцным апорным пунктам гітлераўцаў — Лоевам — і рушылі наперад. 17 кастрычніка 1943 года гарадскі пасёлак быў вызвалены. 20 кастрычніка камандуючы войскамі Беларускага фронту генерал арміі Канстанцін Ракасоўскі загадаў спыніць наступальныя дзеянні і перайсці да трывалай абароны на дасягнутых рубяжах.

У баях за Лоеў загінула 8 тысяч 547 воінаў. Пахаваны яны на тэрыторыі Лоеўшчыны. Сярод іх — 39 (па іншых звестках 43) Герояў Савецкага Саюза. Найвышэйшага звання былі ўдастоены і беларусы. У прыватнасці, ураджэнец Шуміліншчыны Пётр Акуцыёнак. Пры фарсіраванні Дняпра каля Лоева ўзвод пад яго камандаваннем першым пераадолеў раку і захапіў плацдарм. Выконваючы задачу пашырыць захоплены плацдарм і прарвацца ўглыб абароны ворага, байцы ўзвода выбілі праціўніка з траншэі. На захопленай вышыні Пётр Акуцыёнак узняў чырвоны сцяг. Адважны баец загінуў у баі 15 кастрычніка 1943 года. Імем Героя названы вуліцы ў Лоеве і Шуміліне, на шумілінскай школе № 1, дзе ён вучыўся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Баі каля Лоева — адна з яркіх старонак гераічнага летапісу бітвы за Беларусь. Тут пры фарсіраванні Дняпра, захопе і ўтрыманні плацдарма савецкія воіны паказалі высокія маральна-баявыя якасці: смеласць і небывалую адвагу, вынаходлівасць і высокае баявое майстэрства, упартасць і настойлівасць пры выкананні пастаўленай задачы, мужнасць і гераізм, салдацкае сяброўства і ўзаемавыручку.

Часткай бітвы за Днепр з'яўлялася Гомельска-Рэчыцкая аперацыя, якая праводзілася Беларускім (да кастрычніка 1943 года — Цэнтральны) фронтам пад камандаваннем Канстанціна Ракасоўскага з 10 да 30 лістапада 1943 года. Задача аперацыі заключалася ў разгроме Гомельска-Рэчыцкай групоўкі праціўніка, вызваленні Гомеля і ўсяго міжрэчча Сожа і Дняпра. Акрамя таго, планавалася заняць зручныя пазіцыі для далейшых наступальных аперацый у Беларусі. Утрымаўшы і пашырыўшы Лоеўскі плацдарм на правым беразе Дняпра, камандаванне Беларускага фронту засяродзіла тут моцную групоўку для нанясення галоўнага ўдару ў напрамку Гомеля і Рэчыцы.

Пачаліся кровапралітныя баі. У пасляваенныя гады за дняпроўскім берагам каля Лоева замацавалася назва Бераг Герояў. За подзвігі, здзейсненыя пры вызваленні Лоеўскага раёна, звання Героя Савецкага Саюза былі ўдастоены 365 воінаў. Усяго за фарсіраванне Дняпра восенню 1943 года найвышэйшага звання былі ўганараваны звыш 600 чалавек. Амаль кожны чацвёрты — пасмяротна.



Мемарыяльны комплекс «Бітва за Днепр» у Лоеве,
дзе ўвекавечаны 365 воінаў, уганараваных званнем Героя Савецкага Саюза
за баі на лоеўскім плацдарме і вызваленне раёна.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Барыс ДАЎГАТОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**
**і з адкрытых крыніц.**

Юбіляры

# ФАЛЬКЛОРНЫЯ ПЕСНІ Ў СТЫЛІ ДЖАЗА

## Кіраўнік Магілёўскіх гарадскіх аркестраў Аляксандр Гарадкоў пра тое, чым на працягу 10 гадоў здзіўляе гледачоў

**СЁЛЕТНІ год для музыкантаў, аб'яднаных пад назвай «Магілёўскія гарадскія аркестры», юбілейны — 10 гадоў з дня ўтварэння. Гэта не значыць, што раней у горадзе аркестраў не было, яны існавалі, і нават не адзін. Але ў якасці самастойнага суб'екта ўтварэнне існуе з 2013 года. Увесь гэты час у яго руля таленавіты дырыжор і трубач Аляксандр Гарадкоў. Там, дзе з'яўляюцца яго музыканты, заўсёды весела і дынамічна. Пра тое, што атрымалася дасягнуць за 10 гадоў самастойнасці, — наша з ім размова.**



### Гарадскія рытмы

Восенню ў Магілёве праходзіў першы міжнародны кааперацыйны форум па імпартазамяшчэнні, дзе сабралася шырокае бізнес-прадстаўніцтва з Беларусі і Расіі. Дзелавыя людзі, здаецца, не схільныя здзіўляцца. Яны вельмі сур'ёзныя, цалкам засяроджаны на сваіх справах. Але першыя гукі аркестра прагучалі так інтрыгуюча, што бізнесмены пацягнуліся бліжэй да музыкантаў. На тварах з'явіліся ўсмешкі, нехта стаў прытанцоўваць. Падумалася, што пасля такога прыёму, напэўна, і перагаворы пойдуць больш плённа.

Пад адной назвай «Магілёўскія гарадскія аркестры» існуюць два ўнікальныя калектывы — гарадскі духавы аркестр і аркестр народных інструментаў. У адным калектыве 36 чалавек з улікам галоўнага дырыжора, у другім — 10. Музыканты дзялілі пляцоўку з Уладзімірам Прасняковым, Евай Польнай, летась працавалі на разагрэве гурта «На-на» ў Ніжнім Тагіле.

— На канцэрт у Ніжнім Тагіле было прададзена 30 білетаў, мы пайгралі паўгадзіны, а на наступны дзень была поўная зала, людзі стаялі нават у праходах, — з гонарам расказвае **дырэктар і галоўны дырыжор ДУК «Магілёўскія гарадскія аркестры» Аляксандр ГАРАДКОЎ.**

З гарадскім духавым аркестрам звязана прыгожая традыцыя. Кожны сезон па нядзелях ён іграе на фантанах (у скверы 40-годдзя Перамогі), дзе збіраюцца людзі паважанага ўзросту і танцуюць. Такое ёсць толькі ў Магілёве. Пачынаецца сезон у маі і заканчваецца апошняй нядзеляй верасня. За лета адбываецца 18—20 канцэртаў. У рэпертуары шмат любімых народам мелодый, але дзве прысутнічаюць заўсёды. Бо, калі яны не прагучаць, нехта абавязкова падыдзе і папракне: чаму сёння нашых любімых падэспаня і кракавяка не было?

### Грант ад Прэзідэнта

У іх шмат цікавых праектаў. Некалькі гадоў таму яны атрымалі грант Прэзідэнта пад праект «На гэтай зямлі жыць табе і мне».

— Мы зыходзілі з нашых нацыянальных традыцый, — расказвае Аляксандр Гарадкоў. — Шукалі фальклорныя народныя песні і рабілі пад іх джазавыя аранжыроўкі. Адну з іх пачуў у іншым гучанні ад свайго сябра Сяргея Валчкова, які выйграў у праекце «Голас-2». Ён спяваў не так, як гэта робіць у застоллі. І я падумаў, што, можа, ён прыедзе ў Магілёў, і мы выканаем яе разам з аркестрам. Зрабілі аранжыроўку, сталі выконваць — не гучыць. Дзесяць разоў перарабілі, але дайшлі да гучання, якое ўсіх задаволіла. Гэта вельмі скрупулёзная праца. Мелодыя круціцца, ты спрабуеш яе як паліто прымераць на калектыў, і калі ўсё атрымліваецца, гэтым вірусам заражаюцца ўсе навокал: і музыканты, і аранжыроўшчык, а потым і гледачы. Праект, пад які мы атрымалі грант, задумваўся з мэтай прадставіць нашу беларускую культуру ў больш сучасным гучанні. У аркестра дзякуючы яму з'явілася каля 25 новых аранжыровак.

### Ведаюць у Хабараўску

Міжнародная дзейнасць асобая фішка Магілёўскіх гарадскіх аркестраў. За 10 гадоў музыканты тройчы былі у Туле на міжнародным фестывалі «Фанфары Тульскага Крамля», удзельнічалі ў Міжнародным фестывалі духавых аркестраў імя Агапкіна і Шатрова ў Тамбове, ва Усерасійскім фестывалі духавых аркестраў «На сопках Маньчжурыі» ў Самары, выступалі ў Санкт-Пецярбургу, Екацярынбургу, Ніжнім Тагіле, у Хабараўску на фестывалі «Амурскія хвалі».

У Хабараўск прадстаўнікі Магілёўскіх гарадскіх аркестраў ездзілі ў складзе дэлегацыі, прысутнічалі пры падпісанні дакументаў аб пабрацімстве. Было шмат выступленняў, адно з якіх на Лядовай арэне.

— Нас там вельмі цёпла прымалі, — кажа Аляксандр Гарадкоў. — Калі малы склад іграе беларускую музыку з рэпертуару «Песняроў» — «Беларусія», «Алеся», а сем тысяч хорам падпявае, гэта дарагога варта. На наступны дзень мы выступалі ў зборным канцэрце на галоўнай плошчы горада, дзе сабралася, напэўна, тысяч 30 чалавек. Планавалася выступленне на 20 хвілін, а мы гралі гадзіну, і нас не адпускалі.

Летась на плошчы Адзінства ў Магілёве прайшоў ініцыяваны Аляксандрам Гарадковым плац-канцэрт духавых аркестраў, у якім акрамя гарадскога духавога аркестра ўдзельнічалі духавыя аркестры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, вайсковай часці 6713, Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, магілёўскіх гімназіі-каледжа мастацтваў імя Я. Глебава і каледжа мастацтваў, Тульскай абласной філармоніі імя І. Міхайлоўскага.

Ёсць жаданне стварыць на базе гэтага мерапрыемства фестываль з прыцягненнем аркестраў з Беларусі і Расіі і прымеркаваць яго да Дня горада.

### Аркестравае дэфіле

Аляксандр Гарадкоў яшчэ калі вучыўся ў Акадэміі музыкі спрабаваў сябе ў розных аркестрах. Іграў у Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестры, канцэртным аркестры «Няміга» і гэтак далей. Быў вопыт работы ў Карэі.

— Нядаўна пераглядаў той даўні відэазапіс і сам здзівіўся, як атрымлівалася, — усміхаецца суразмоўнік. — Там працавалі так: спачатку вучылі нотны рэпертуар, потым прыходзіў харэограф і рабіў пастаноўку. Адна справа — калі ты проста музыку іграеш, а другая — калі яшчэ і танцуеш. Мы скакалі як сайгакі, прычым з лёгкасцю. Тады я быў студэнтам, у мяне яшчэ хапала на гэта сіл. Паездка ў Карэю была для мяне выйгрышным білетам. Прайшоў кастынг, і адзін з нямногіх трапіў у склад. Тое, што я рабіў у Карэі, называецца за мяжой шоу, у Расіі гэта носіць назву — аркестравае дэфіле.

Папярэдні вопыт спатрэбіўся максімальна. Работа з вядомымі дырыжорамі, музыкантамі, падбор рэпертуару — усё гэта спрасціла жыццё. З'явілася шмат знаёмстваў, якія працягваюцца дагэтуль. Акрамя актыўнай гастрольнай дзейнасці і канцэртаў у Беларусі, Магілёўскія гарадскія аркестры ўдзельнікі тэлепраекта «Я магу», «Х-Фактар», «Гумар на вайне, або Смех праз слёзы».

На YouTube ёсць ролік з запісам тэлепраекта «Я магу», дзе Генадзь Хазанаў, які задзейнічаны там у якасці эксперта, гаворыць пра магілёўскіх музыкантаў: «Мне спадабалася ваша рэжысура нумара, як вы рухаліся, танцавалі. Гэта незвычайна. Малайцы».

Музыканты аркестраў пастаянныя госці тэлепраграм на «Беларусь 4 Магілёў», віцебскім тэлебачанні. Восем гадоў запар яны ўдзельнікі «Славянскага базару».

— Музыка не толькі перадача нотнага матэрыялу, мастацкай задумкі. З дапамогай музыкі працэс мецэ стасункі з людзьмі — яна перадае эмоцыі. Жэст, усмешка дырыжора, вясёлыя вочы артыста — гэта і ёсць сувязь з гледачом, — лічыць суразмоўнік. — У гэтых элементарных рэчах шмат сэнсу. У залежнасці ад мерапрыемства робім падбор музыкі. Самы складаны пасаж музыкант павінен паказаць з лёгкасцю. У гэтым і ёсць прафесіяналізм.

### «Дзеці на нашых канцэртах могуць рабіць усё што заўгодна»

— Аднойчы на нашым канцэрце завуч адной са школ зрабіла заўвагу дзецям, каб яны не шумелі і адключылі тэлефоны, — кажа Аляксандр Гарадкоў. — Гэта была самая галоўная і непрадуманая правакацыя для дзяцей. Яны ж маюць звычку рабіць усё наадварот. Таму я набраўся нахабства і дазволіў ім праяўляць эмоцыі так, як яны таго пажадаюць. Пад канец дзеці прытанцоўвалі пад нашы мелодыі.

Ёсць нават спецыяльны патрыятычны праект для дзяцей. І каб сур'ёзная тэма лягчэй даходзіла да іх, стасункі адбываюцца ў інтэрактыўнай форме. Пад кіраўніцтвам вядучай хлопчыкі і дзяўчынкі адбіваюць такт рукамі, нагамі спачатку разам, потым па чарзе адна палова зала і другая. Атрымліваецца цікавая музычальная гульня. Пад канец дзеці бягуць на сцэну, каб сфатаграфавацца з музыкантамі. У іх радасны настрой, вочы блішчаць.

Магілёўскія аркестры шмат працуюць і з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Малы склад духавога аркестра ездзіў у Ніжні Ноўгарад на фестываль інклюзіўнай культуры. У Магілёўскай вобласці музыканты наведваюць сацыяльныя ўстановы, выступалі, напрыклад, у Бялыніцкай школе-інтэрнаце, дзе выхоўваюцца дзеці з інваліднасцю, расказвалі ім пра інструменты. І гэтыя кантакты таксама вельмі важныя, бо прыносяць радасць і музыкантам, і іх юным слухачам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і з архіва Магілёўскіх гарадскіх аркестраў.**

# АПОШНЯЯ ВУЧАНІЦА РЭРЫХА

## У БДАМЛіМ прайшоў круглы стол

**Па-рознаму складваецца шлях мастака да славы. Хтосьці ўражвае сваім дэбютам і яшчэ ў маладосці смелымі крокамі ўздымаецца да самай вяршыні. Хтосьці даказвае свае права на месца ў гісторыі мастацтва ў сталасці. А хтосьці ўсё жыццё працуе, не імкнучыся прыцягваць увагу, застаючыся на маргіналіях, але па сваім таленце мае не меншае значэнне, чым тыя, хто ў цэнтры віра. Зінаіда Астаповіч-Бачарова — мастачка менавіта такога тыпу. Апошняя вучаніца Рэрыха і Білібіна на Беларусі, яна пражыла доўгае жыццё, дзевяноста пяць гадоў, і толькі пад канец шляху яе адкрылі мастацтвазнаўцы. Цяпер яе залічваюць да пантэону найлепшых мастакоў Беларусі, гэтак жа, як яе брата, графіка Аркадзя Астаповіча, які загінуў на фронце Вялікай Айчыннай.**



29 снежня ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва адбыўся круглы стол і вечар памяці «Закаханая ў творчасць», прысвечаныя 125-годдзю з дня нараджэння Зінаіды Астаповіч-Бачаровай. Адкрылася выстава твораў мастачкі, была прэзентавана прысвечаная ёй кніга, якая выйшла ў рамках сумеснага праекта Нацыянальнага мастацкага музея і выдавецтва «Беларусь», серыя паштовак з яе працамі, паказаны дакументальны фільм «Мне — 91 год» (1989), у якім мастачка распавядае пра сваё жыццё.

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Алена Макаранка звярнула ўвагу прысутных на непаўторную манеру малюнкаў, прадстаўленых на выставе, многія з якіх прысвечаныя сям'і і напоўненыя цеплынёй стасункаў.

Унучка Зінаіды Астаповіч-Бачаровай, **кандыдат гістарычных навук, дацэнт БДУ Алена СМІРНОВА,** пацвердзіла, якая непаўторная сямейная атмасфера стваралася дзякуючы яе бабулі. Яна была заўсёды ў атачэнні кніг, карцін, старых фотаздымкаў. Зінаіда, як і яе брат Аркадзь, нарадзілася ў Мінску. Вучылася ў Гродзенскай гімназіі, потым, у 1914-м, скончыла Марыінскую гімназію ў Петраградзе. Алена Смірнова паказала ўнікальныя фотаздымкі бабулі гімназічнага перыяду, сярод іх — адна з так званых «жывых карцін», якія ўвасаблялі гімназісткі. Паказала і фотаздымкі брата Зінаіды Аркадзя Астаповіча таго часу, калі яны з сястрой выкладалі ў Навасёлкаўскай школе — Аркадзь тады хадзіў у шортах, пашытых мацi, чым вельмі здзіўляў вяскоўцаў, бо такой моды на Беларусі яшчэ не было. Апошнія трыццаць гадоў Зінаіда Астаповіч-Бачарова жыла ў Віцебску, у сям'і дачкі.

— Вядома, бабуля на мяне вельмі паўплывала. Напрыклад, убачыўшы кніжку Чукоўскага, магла сказаць: «А я яго ведаю». І распавесці пра сустрэчы з ім у якім-небудзь дваццаць пятым годзе ў выдавецтве. «Ён быў настолькі высокі, што сядзеў не на крэсле, а звычайна на стале». Ці раптам кажа: «Я ведала і Маршака, мы сустракаліся ў выдавецтвах, ён мяне праводзіў». Падобна, Маршак спрабаваў заляцацца да бабулі, але яна была вельмі сціплым чалавекам, і яе адпалохала самаўпэўненасць маладога паэта: «Вы ведаеце, хто я? Я Маршак!». Бабуля заўсёды сачыла за навінкамі літаратуры. Любіла хадзіць у берэтах, звычайна шыла іх сама. Летам — у саламяным капялюшыку. Была вельмі далікатнай, але заўсёды рабіла толькі тое, што лічыла патрэбным. Па-сапраўднаму інтэлігентная, выхаваная, ніколі не павышала голасу. Вельмі спакойна і мудра ўспрыма-

# Хараство мазаікі рукамі маладых творцаў

**Ці часта вы глядзіце на будынкі, калі ідзяце па горадзе? Хутчэй за ўсё, калі бачыце адметную архітэктуру, упрыгожванне ці малюнак. А ёсць месцы, дзе ўсё гэта можа сыходзіцца і радаваць не толькі вока, але і душу. Напрыклад, гістарычны цэнтр сталіцы — і для шпацыру, і для роздуму. А неўзабаве там з'явіцца яшчэ адна нагода і для першага, і для другога. На адным з будынкаў у цэнтры Мінска студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў выконвалі работы па стварэнні мазаікі, якую нам хутка прадставяць.**

**Канешне, гэта факт адметны. Яшчэ за савецкім часам мазаіку часта выкарыстоўвалі дзеля ўпрыгожвання фасадаў будынкаў, а беларускія мастакі-класікі стваралі мазаікі вельмі актыўна. Але потым усё змянілася, здавалася, што гэта мастацтва сыходзіць. Дык не павінна!..**

**Эскіз мазаікі ў прывязцы да архітэктуры на мясцовасці і кардоны (творы) у натуральную велічыню былі зацверджаны на манументальным савеце. Пасля заўваг і прапаноў, якія ўлічвалі стваральнікі, праект атрымаў увасабленне. Над ім працавалі Настасся Касавец, Ксенія Мазурава, Наталля Марчанка, Настасся Ліхачэўская пад кіраўніцтвам свайго выкладчыка, супрацоўніка кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай акадэміі мастацтваў Аляксандра Томчыка, які патлумачыў, чаму такую адказную працу даверылі студэнтам:**

— Апошнім часам мазаіка ў нас была прадстаўлена ўзорамі царкоўнага мастацтва — гэта выкананне абразоў, іканапісных кампазіцый. Якраз у студэнтаў гэтага курса была папярэдняя праца: арнаментальнае пано для храма Іаана Прадцечы ў аграгарадку Буйнічы Магілёўскага раёна. Чатыры студэнткі пад маім кіраўніцтвам выконвалі тры арнаментальныя нішы. А за два семестры цягам аднаго году папярэдні курс выканаў дзве часткі адной вялікай мазаікі Збаўцы — кампазіцыя «Уваскрасенне Хрыстова». На галоўным фасадзе рабілі мазаічны абраз Іаана Хрысціцеля. Я распрацоўваў эскіз, была рэалізаваная лікавая частка — рукі і твар. Астатняе выконвалі студэнты ў рамках задання на семестр. Мы рабілі гэтыя мазаікі пры супрацоўніцтве з Беларускай праваслаўнай царквой, а такая праца не застаецца незаўважанай: на яе звярнулі ўвагу адказныя асобы горада Мінска. І вось у кіраўніцтва горада таксама ўзнікла ідэя супрацоўніцтва з акадэміяй. Да нас звярнулася «Мінская спадчына» з прапановай стварыць мазаікі, якія б маглі ўпрыгожыць сталіцу. Разглядаліся некалькі месцаў для магчымага размяшчэння мазаік: у музычным дворыку ў Верхнім горадзе ёсць нішы, з якімі можна было б працаваць, але там патрабаваліся большыя па памеры работы, каб яны добра выглядалі ў архітэктурным асяродку. Для нашых студэнтаў гэта была б складаная задача — чыста фізічна. Атрымліваецца, што толькі гэты курс цяпер праходзіць такое заданне. Курс нешматлікі, а вучэбны час не бясконцы. Трэба было ўкласціся ва ўсе ўмовы, гэта было звязана з навучальным працэсам і магчымасцямі падрыхтоўкі студэнтаў. Насамрэч нам пашчасціла, што гэты курс ужо паспрабаваў свае сілы на пано ў нішы храма на Магілёўшчыне падчас летняй практыкі. І з добрым укладненнем задач у рамках вучэбнага працэсу яны цяпер выканалі кампазіцыі для Мінска. Самі распрацоўвалі эскізы. Найлепшы выбіралі калегіяльна, на конкурснай аснове. Аўтарам эскіза, які перамог, стала Настасся Касавец. З выхаваўчага пункту гледжання, гэта добра, што студэнты адразу прывучаюцца да прафесійнага бачання работ. Яны пастаўлены ў такія конкурсныя ўмовы, з якімі мы пастаянна сутыкаемся ў жыцці: альбо перамагаеш ты, альбо перамагаюць цябе...

Адметнасць працы яшчэ і ў тым, што студэнты рабілі ўсё самі, у рамках навучальнага працэсу. А яны навучаюцца такім важным рэчам, як сінтэз архітэктуры і мастацтва, вучацца разуменню, як правільна ўваходзіць у архітэктуру, не разбураючы яе, як дапаўняць архітэктурныя элементы, што маюцца. Потым узгоднены эскіз паляпшаецца і маштабуецца ў натуральную велічыню праз кардон. І гэта ўсё таксама рабілі студэнты. Як і прысутнічалі на нарадах, выслухоўвалі заўвагі і прапановы ад сяброў камісіі, напрыклад, як можна паспрыяць таму, каб колеравая танальнасць, уласцівая Беларусі, ці таўшчыня ліній не спрачаліся з архітэктурнымі элементамі...

Вынік мы неўзабаве пабачым у раёне Траецкай набярэжнай на фасадзе аднаго з будынкаў. Будынак мае гісторыка-культурную каштоўнасць, таму да яго такая ўвага. Дазвол на работу быў узгоднены з адпаведнымі органамі і камісіямі, у тым ліку з Міністэрствам культуры Беларусі. Падрабязнасцяў пакуль раскрываць не будзем — няхай чакае сюрпрыз падчас урачыстага адкрыцця, якое рыхтуецца. Аднак варта адзначыць, што будынак выбіралі не проста так, а каб можна было ўпісаць у яго мазаікі і каб бачна было яго і з набярэжнай, і з Верхняга горада.

— Мы не мелі права зрабіць кепска, — кажа Аляксандр Томчык. — Таму ў нашай працы ёсць сувязь з культурнымі традыцыямі, пераасэнсаванне і папулярызацыя беларускіх народных рамёстваў. І атрымаўся даволі цікавы вынік, які, спадзяюся, задаволіць усіх. А студэнты ўжо задаволены. Адна справа ў рамках вучэбнага працэсу выконваць работы, якія ніхто не ўбачыць, акрамя настаўніка і калег, а зусім іншае — калі ў іх ёсць магчымасць для шырокай рэалізацыі сваіх задум. Гэта павышае інтарэс да справы, якой яны навучаюцца. А калі рэалізаваная замова ўжо ў студэнцкія гады, то гэта дае надзею, што пасля выпуску з акадэміі спецыялісты не будуць прадстаўлены самі сабе. У нас штогод выпускаецца шмат мастакоў з розных навучальных устаноў, але не ўсе могуць знайсці рэалізацыю, прымяніць свой творчы патэнцыял. Дзякуючы такім замовам студэнты разумеюць, што калі валодаеш рамяством, калі ўзяў веды і досвед у сценах акадэміі, то ўсё будзе добра.



І крыху пра рамяство... Мазаіка — складанае мастацтва. З дапамогай дробных каляровых шкляных кавалачкаў можна выкласці складаныя і прыгожыя малюнкі. У Візантыі, напрыклад, калісьці дасягнулі такіх вышынь у гэтым, што да нашага часу дыханне спыняецца, калі бачыш абразы святых, якія вылучаюць святло, — у майстроў была адпаведная задача. Але ж мазаіка неабавязкова павінна зіхацець, усё залежыць ад мэты, ад задачы, якую ставяць майстры. У нашым выпадку — крыніцай натхнення для мастакоў, што працавалі над мазаікай для будынка ў Мінску, сталі такія традыцыйныя беларускія тэхнікі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, як вышыўка, ткацтва, выцінанка. Выбар колераў і стылізаваны малюнак даюць спасылку на народнае мастацтва, звяртаюць да вытокаў. Але ж мала распрацаваць. Дзяўчаты пад кіраўніцтвам свайго выкладчыка ўсе гэтыя ўзоры самі выкладвалі! Адметна, што і тэхналогія вырабу матэрыялу атрымала мясцовую інтэрпрэтацыю.

— Смальта — гэта пераплаўленыя кавалкі шкляной масы разам з пігментамі. Яна расплаўлялася, як у былыя часы (і за савецкім часам так рабілі), потым застывала ў выглядзе цаглінкі, далей яе разразалі і калолі на дробныя кавалачкі. У нас ёсць уяўленне пра гэта, захаваліся ўзоры старой смальты, — тлумачыць Аляксандр Паўлавіч. — Але сёння пры сучасных тэхналогіях можна, захоўваючы сутнасць, змяніць падыход да вырабу смальты. У дадзеным выпадку мы атрымалі беларускую смальту. Яе тэхналогію распрацаваў выпускнік нашай кафедры Аляксей Бычкоў. Шкляная маса бітага шкла перамешваецца з пігментам і спякаецца ў адну прыроду — пры пагранічным стане, калі адбываецца растварэнне шкла. Дасягаць гэтага можна ў сучасных печках (не доменных). Такім чынам адбылося паляпшэнне тэхналогіі, яе асучасніванне. Аляксей Бычкоў вучыўся на нашай кафедры, мае вялікі практычны досвед у ф'юзінгу, вітражы і ў мазаіцы, таму і прыйшоў да такога выніку. Можна лічыць, што гэта яшчэ адно дасягненне нашай кафедры і акадэміі наогул, бо гэта наш чалавек і яго напрацоўка. Наогул, паводле таго, якія замовы мы выконвалі апошнім часам, можна казаць, што цікавасць да мазаікі расце. І можна казаць пра ўтварэнне беларускай школы дзякуючы развіццю і нашай кафедры ў тым ліку. Як некаторыя нашы калегі ў Расіі кажуць «Мінская школа». Матэрыял гаворыць сам за сябе — ён даволі эфектны. Проста раней работа была прадстаўлена ў асноўным царкоўнай мазаікай, што заставалася па-за зрокам шырокай грамадскасці. З'явілася магчымасць выйсці ў шырокую гарадскую прастору. І я ўпэўнены, што гэта будзе не апошняя магчымасць для нас паказаць сябе. У тым ліку таму, што ў грамадскасці і нашага кіраўніцтва ўсіх узроўняў ёсць запыт на беларускую культуру. На яе папулярызацыю, на асэнсаванне свайго месца ў свеце. Таму ёсць патрэба ў такіх творах, павышаецца іх значнасць.

Варта чакаць, што праект, выкананы па замове горада, уздыме цікавасць і да кафедры манументальнага мастацтва з боку тых, хто цяпер выбірае сабе прафесію і разглядае творчыя варыянты.

— Выпускнікі нашай кафедры запатрабаваныя — пра гэта сведчыць вялікі спіс запытаў на спецыялістаў-манументалістаў пры размеркаванні. Таму што нашы студэнты не толькі творцы (якія могуць працаваць у тым ліку выкладчыкамі дзіцячых цэнтраў ці школ мастацтва). Яны яшчэ і «тэхнары». Акрамя таго, шырокі спектр унутраных прафесій, якім у нас навучаюцца: гэта і мазаічыст, і вітражыст, і майстар насценных роспісаў, роспісаў па ляўкасе і ў тэхніцы энкаўстыка... У нас можна атрымаць вялікую скарбонку ведаў і ўменняў.

Але што можа паспрыяць папулярызацыі лепш, чым гатовая праца, якую пагля́дзець можа кожны?.. А некаторыя, магчыма, і задумаюцца: а ці не паспрабаваць зрабіць хараство ўласнымі рукамі? Наогул, варыянтаў, як зрабіць хараство, манументалісты ведаюць шмат. Напрыклад, ёсць мазаіка, зробленая з традыцыйнай смальты (фарбаванае шкло). Як кажуць студэнты кафедры вывучаюць візантыйскае мастацтва. Наогул, класічнаму мастацтву — розных відаў — увага вялікая. А яшчэ ёсць царкоўнае мастацтва. Нават мастацтва мадэрн: увявіце сабе, у праграме заданні па вывучэнні мазаікі з натуральнага каменю ў розных тэхніках. Мазаіка з галькі — гэта вельмі атмасферна і прыгожа. Але чым больш глядзіш, тым больш дзівішся: людзі сваімі рукамі могуць ствараць цуды там, дзе жывуць і з таго, што бачаць, і пра тое, што дорыць радасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# І БІЛІБІНА НА БЕЛАРУСІ

## да 125-годдзя Зінаіды Астаповіч-Бачаровай

ла жыццё. З дзяцінства мы з братам чулі кожны дзень бабуліны казкі, любаваліся кветкамі, якія яна вырошчвала.

На пытанне, чаму ў творчай спадчыне Зінаіды Астаповіч-Бачаровай столькі ілюстрацый да кніг, а яшчэ малюнкаў на тэму тэатра, балета, оперы, Алена Смірнова адказала, што гэтая любоў яшчэ ад бабулінай маці, якая была «сабініцкай» — прыхільніцай опернага спевака Собінава, шмат хадзіла па тэатрах, любіла балет. У альбоме ёсць выява зробленай Зінаідай Астаповіч-Бачаровай фігуркі знакамітай у 1920-х балерыны Спясіўцавай. А кнігі Зінаіда Бачарова ілюстравала не на замову, а для сябе — чытала і ілюстравала, працуючы ў самай рознай тэхніцы.

— Прыемна, што кніга пра Зінаіду Бачарову выйшла ў серыі «Славутыя мастакі Беларусі», дзе выдадзеныя кнігі пра Хруцкага, Ваньковіча ды іншых прызнаных майстроў, — адзначыла вядомы **мастацтвазнаўца Надзея УСАВА, вядучы навуковы**



**супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея,** аўтар згаданай кнігі. — З сарака чатырох кніг гэтай серыі толькі пяць прысвечаныя жанчынам, адна з тых жанчын — Зінаіда Астаповіч-Бачарова. Пра гэтую мастачку яшчэ нядаўна ніхто не ведаў. Яна адносіцца да тыпу мастакоў, якія абралі застацца невядомымі. Яна была апошняй вучаніцай Рэрыха і Білібіна ў Беларусі, ужо з-за гэтай акалічнасці ў яе меліся падставы прасіць, каб ёй арганізавалі выставу. Але яна ніколі такога не рабіла. Блукала па горадзе, пісала краявіды, складвала малюнкі ў папкі і маўчала. Калі я наведала яе ў Віцебску, убачыла сотні прац, цудоўных, арыгінальных. У кнізе мы хацелі паказаць мастачку ў розных іпастасях — яна і графік эпохі «Мира искусства», і партрэтыст, і ілюстратар, і аўтар плакатаў. Усё, што вы бачыце на гэтай экспазіцыі — працы музейнага ўзроўню. А звярніце ўвагу на яе імпрэсіяністычныя замалёўкі Віцебску — асабліва ўражваюць гуашы, напісаныя на натуры.

Вядомы краязнаўца Юрый Важнік распавёў пра свой праект «Геній майго месца» — падарожжы па Беларусі, у асноўным па роднай для аўтара праекта Пухаўшчыне. Кожны маршрут распавядае пра знакамітых людзей. Адзін з маршрутаў праекта прысвечаны Зінаідзе Астаповіч-Бачаровай, ёсць згадкі пра брата і сястру Астаповічаў і ў іншых маршрутах. Цікавыя выявы праекта — калі старыя фотадымкі, зробленыя Аркадзем Астаповічам, сумяшчаюцца з сучаснымі краявідамі Пухаўшчыны, дзе знаходзіцца Навасёлкі.

Напрыканцы сустрэчы прысутныя паглядзелі дакументальны фільм «Мне — 91 год». На пытанне, ці не шкадуе яна, што пражыла доўгае жыццё і ні разу не выстаўлялася, засталася невядомай, Зінаіда Астаповіч-Бачарова ў фільме адказала: «А чаго шкадаваць? Бачыце — вось вы цяпер мною заняліся, значыць, нейкі вынік атрымаўся».

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ,**
**фота аўтара.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

**Лот № 1.** Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом (фундамент – бетон, площадь застройки – 74 кв. м, процент готовности – 12 %) и земельный участок с кадастровым № 221287012101000876 площадью 0,1500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Солнечная, 56. Ограничения: охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт.
**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/зем. участок): **13631,12** (4616,12/9015,00) бел. руб.
**Задаток:** 1363,00 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 33,86 %.
**Реквизиты для внесения задатка: р/с**: BY87 AKBB 3604 3141 0001 5200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300977139, код операции 40901. Получатель платежа: Новкинский сельисполком

**Дата, время и место проведения аукциона**: **05.01.2024 в 15.00 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 05.12.2023 до 13.00 04.01.2024. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона:** в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта, разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на зем. участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить возведение жилого дома в сроки, установленные Указом Президента РБ от 07.02.2006 № 87, выполнить ввод жилого дома в эксплуатацию в соответствии с действующим законодательством. **Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества:** земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.**

**Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ),** которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

**Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

---

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды объекта недвижимости – здания ТП 1, находящегося в собственности Республики Беларусь и хозяйственном ведении РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»**

**Дата проведения аукциона: 22 декабря 2023 г. в 10.00.**
**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7**

| № лота | Наименование объекта аренды, цель его использования | Арендуемая площадь, ($м^2$) |
|---|---|---|
| 1 | **Здание ТП 1 с инв. № 342/С-26544** (для организации розничной торговли, размещения офиса, оказания услуг (в том числе автосервиса), для использования под складские помещения) | **132,8** |

**Местонахождение объекта аренды:** Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, пер. Авиационный, 1/8

**Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 392,76 рубля. Задаток: 392,76 рубля.**
**Коэффициент** к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **0,7.**
**Срок договора аренды: 3 года, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %**

**Местонахождение организатора аукциона, его контакты:**
г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47, 32-18-95, +375 29 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 01.12.2023 г. на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и официальных сайтах Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by и Организатора торгов ino.by**

---

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот: изолированное помещение с инвентарным номером 121/D-3677 (наименование: квартира № 2; назначение: квартира), площадью 25,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Дрогичинский с/с, д. Нагорье, ул. Железнодорожная, д. 71, кв. 2**

| Начальная цена, руб. | 2 433,50 | Размер задатка, руб. | 243,35 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** РСУП «Брестплемпредприятие», г. Брест, ул. Карбышева, 35, тел. 80162530948. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** возможно предоставление рассрочки оплаты стоимости имущества в случае подачи заявления. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 10 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 19 декабря 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/20533), а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 18 декабря 2023 г. до 17.00**

---

## О реализации имущества ООО «Логцентр»

Торги по реализации имущества ООО «Логцентр» (1 лот), назначенные на **01.12.2023 г.** признаны несостоявшимися по причине отсутствия заявок

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290 |
| **Продавец** | ООО «Логцентр», УНП 192757823 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Повторные торги в форме открытого аукциона **12.12.2023 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Скрыганова, 6, оф. 911** |

**Сведения о предмете проведения торгов**

**Объект недвижимости (одним лотом):**
капитальное строение с инвентарным номером 600/С-152974 (наименование – здание склада с АБК, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общая площадь – 5605,3 кв. м, составные части и принадлежности – одно-, двухэтажное смешанной конструкции здание склада с АБК, с водоводом для водоснабжения а1), расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 623687500001000002, 623687500001000006, по адресу: 223039, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Хатежинский с/с, 26, район аг. Хатежино (адрес объекта торгов)

**Сведения о земельных участках:**
- земельный участок с кадастровым номером 623687500001000002, площадь составляет 0,8599 га;
- земельный участок с кадастровым номером 623687500001000006, площадь – 0,8359 га. Назначение земельных участков – для обслуживания административного здания, складских помещений, котельной и инженерных коммуникаций. Предоставлены Продавцу на праве постоянного пользования.

По вопросу ознакомления с предметом торгов, дополнительной информации обращаться по тел.: 8044 7945248, 8017 3750494

**Начальная цена предмета торгов:**
Лот № 1 – 3 282 944,63 доллара США с НДС по ставке 20 %

**Порядок проведения торгов**

Шаг аукциона – 5 %. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявки на участие в них только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Размер задатка, сроки приема заявок и порядок зачисления задатка**

Задаток в сумме 5 % от стоимости предмета торгов – 164 147,23 доллара США перечисляется по лоту в срок по 11.12.2023 на р/с BY78BPSB30121732950169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, код BPSBBY2X, получатель – ООО «ЛиквидБай», УНП 192290290, назначение платежа – задаток за участие в аукционе. Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату внесения платежа. Задаток должен быть внесен до подачи заявки на участие в торгах. Прием заявок с приложением документов осуществляется заказной корреспонденцией в адрес ООО «ЛиквидБай» (220079, г. Минск, а/я 256) либо по e-mail: info@likvid.by до 17.00 11.12.2023

| | |
|---|---|
| **Возмещение затрат** | Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и вознаграждение Организатору аукциона по результатам аукциона в размере 0,5 % от окончательной цены продажи Объекта в течение 5 дней со дня проведения аукциона |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявка на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка; документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах |

Извещения о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.10.2023, 21.11.2023

---

Центр Промышленной Оценки
- **ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
- **ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Житковичский моторостроительный завод», Гомельская обл., г. Житковичи. УНП 400049955 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов** – оборудование, бывшее в употреблении
Местонахождение: Гомельская обл., г. Житковичи

| Лот № | Наименование | Инв. № | Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | **Станок резьбонакатной UPW1251** | HP-349 | **7 440,00** |
| **2** | **Станок токарно-винторезный ИЖ-250П** | ТВ-224 | **3 720,00** |

**Условия торгов:** демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** после проведения торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 6 % от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.09.2023

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 18.12.2023 в 11.00. Окончание торгов: 18.12.2023 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.12.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Узденский райагросервис»** (продавец)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА:

Лот № 1: **здание бани с инв. № 623/С-58834 общей площадью 176,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683200004000008 площадью 0,2587 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, 9.**
Начальная цена с НДС (20 %) – **3 816,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **381,00** бел. руб.
*Стоимость снижена на 70 %.*

Лот № 2: **баня с инв. № 623/С-58260 общей площадью 179,2 кв. м, расположенная на земельном участке с кадастровым номером 625683205301000099 площадью 0,1500 га** *(право аренды по 14.07.2066)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Костюки, ул. Центральная, 1А.**
Начальная цена с НДС (20 %) – **14 040,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 404,00** бел. руб.
*Стоимость снижена на 40 %.*

Лот № 3: **здание столовой с инв. № 623/С-57842 общей площадью 83,6 $м^2$, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625684211601000157 площадью 0,0467 га** *(право аренды по 2110)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Узденский с/с, д. Тычинки, ул. Молодежная, 19а.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 5 508,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **550,00** бел. руб.
*Стоимость снижена на 10 %.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения по лотам №№ 1, 2 опубликованы в газете «Звязда» от 05.07.2023, 11.10.2023, по лоту № 3 – от 31.08.2023.

Аукцион состоится **28.12.2023** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.12.2023** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (01718) 68-6-73, 8 (029) 936-28-18.**

УНП 600000330

# БАНДЫ ШВЕЦЫІ

## Чаму скандынаўскую краіну захліснула крывавая хваля гвалту?



**Для жорсткай барацьбы з крымінальнымі элементамі, якія тэрарызуюць насельніцтва, у Швецыі прыцягнулі вайсковыя падраздзяленні. Аб гэтых надзвычайных мерах прэм'ер-міністр Ульф Крыстэрсан аб'явіў на фоне рэзкага росту колькасці нападаў з прымяненнем агнястрэльнай зброі і выбуховых прыстасаванняў, паведаміла «Бі-бі-сі». Разгул злачыннасці дасягнуў такога маштабу, што становіцца магчымым садзейнічанне з боку НАТА. Цярпенне жыхароў краіны на мяжы — у шведскіх гарадах раз-пораз грымяць выбухі, якія ўчыняюцца бандамі падчас разборак, а церпяць простыя грамадзяне. Чаму скандынаўскую краіну захліснула крывавая хваля гвалту?**

### Скотч і вяроўка

У Швецыі праходзіць судовы працэс над падлеткамі, якія ўчынілі самасуд над таксістам-гвалтаўніком. Летась у паліцыю звярнулася 14-гадовая дзяўчынка, якая расказала, што яе згвалтаваў 26-гадовы таксіст родам з Егіпта. Але паліцэйскія палічылі прыведзеныя факты недастатковымі і з прычыны «адсутнасці доказаў» адмовіліся ад праверкі і ўзбуджэння крымінальнай справы. А 26 сакавіка каля горада Энчэпінг было знойдзена пустое таксі, якое захрасла ў снезе. Судзячы па ўсім, кіроўца пакінуў машыну зусім нядаўна — у салоне ўсё яшчэ працаваў лічыльнік. Выкліканыя на месца паліцэйскія западозрылі выкраданне, і на месца была выклікана пошукавая група з сабакамі. Пошукі таксіста зацягнуліся на пяць дзён, хоць яго мёртвае цела вісела ўсяго за паўкіламетра ад аўтамабіля. Ім аказаўся той самы егіпцянін, якога годам раней непаўналетняя дзяўчынка абвінавачвала ў згвалтаванні.

Праведзенае расследаванне паказала, што самасуд над таксістам здзейсніла група падлеткаў. Атрымаўшы адмову ад супрацоўнікаў праваппарадку, дзяўчынка разам са сваім хлопцам (яму на той момант было 16 гадоў) абдумала план помсты. У сакавіку яна напісала таксісту і дамовілася з ім аб сустрэчы. Але разам з ёй на сустрэчу з егіпцянінам з'явіўся хлопец дзяўчыны і трое яго братоў (15, 17 і 18 гадоў). Яны звязалі гвалтаўніка прынесеным з сабой скотчам і павесілі ў лесе. Вырашальным доказам стала ДНК падлеткаў, выяўленая на вяроўцы і скотчы, а таксама перапіска ў месенджары дзяўчынкі — тая напісала сяброўцы аб падрыхтоўцы да здзяйснення злачынства. Падлеткі, якія прызналіся пад ціскам гэтых доказаў, запэўніваюць, што хацелі ўсяго толькі «правучыць» таксіста, а не забіваць яго, але пракуратура сцвярджае адваротнае.

Не выключана, што многія шведы цішком ухваляюць учынак падлеткаў — краіну захліснула сапраўдная эпідэмія згвалтаванняў, віну за якія нясуць, як правіла, мігранты з краін трэцяга свету. Напрыклад, у 2021 годзе колькасць такіх злачынстваў дасягнула 9668 (пры колькасці насельніцтва Швецыі ў 10,5 млн чалавек) — больш як на трэць больш, чым пятнаццаць гадамі раней, паведаміла iz.ru. Вядучыя шведскія СМІ збольшага замоўчваюць праблему, а простыя шведы пішуць у сацсетках, што рост колькасці згвалтаванняў звязаны з занадта мяккімі прысудамі. Напрыклад, нядаўна было вынесена абвінавачванне выхадцу з Самалі, які таксама падзарабляў прыватным возніцтвам.

Самалієц замыкаў жанчын у сваёй машыне і вывозіў за горад, дзе гвалтаваў. Шведская пракуратура прад'явіла яму 16 эпізодаў: два ўчыненыя згвалтаванні, тры спробы згвалтавання, два «сексуальныя замахі», сем спроб незаконнага затрымання, адзін напад і крадзеж асабістых звестак. За гэтыя злачынствы ён атрымаў чатыры гады і дзевяць месяцаў турэмнага зняволення — з наступнай высылкай і забаронай вяртацца ў Швецыю на працягу 10 гадоў. Зразумела, што прысуды такога кшталту не могуць застрашыць гвалтаўнікоў. Акрамя таго, сваё невялікія тэрміны яны адбываюць у камфартабельных шведскіх турмах, камеры ў якіх часта нагадваюць гасцінічныя нумары.

### Няма ўлады

Паводле звестак, на пачатак гэтага года 34,6 працэнта жыхароў Швецыі мелі замежнае паходжанне. З людзей ва ўзросце ад 35 да 44 гадоў гэта каля 44,1 працэнта, з тых, каму ад 25 да 34 гадоў, — 41,1 працэнта, а з дзяцей ва ўзросце ад пяці да дзевяці гадоў — 40,3 працэнта. Найбольшая



доля насельніцтва прыпадае на мігрантаў у такіх буйных гарадах, як Стакгольм, Мальме і Гётэборг. Пры гэтым менавіта мігранты складаюць большую частку шведскага злачыннага свету. Стакгольм і іншыя буйныя гарады дзяржавы раздзіраюць войны этнічных банд, якія складаюцца з беспрацоўнай моладзі, выхадцаў з сем'яў мігрантаў з трэцяга свету. Ахвярамі сутыкненняў часта аказваюцца зусім недатычныя грамадзяне.

Паводле звестак, на сярэдзіну верасня гэтага года злачынцы ўчынілі ў краіне больш за 124 выбухі — большасць з іх у Стакгольме і ў паўднёвых гарадах Швецыі. А ад гэтага пакутуюць простыя шведы, якія мелі няшчасце жыць побач ці проста праходзіць не ў тым месцы ў непрыдатны час. Так, позна ўвечары 26 верасня самаробная выбуховая прылада была падарвана на лесвічнай пляцоўцы аднаго з дамоў раёна Хесельбю на паўночным захадзе Стакгольма. Тры чалавекі былі дастаўлены ў бальніцу, але без небяспечных для жыцця траўм. Як выказала меркаванне паліцыя, зламысінікі рабілі замах на члена мафіёзнай групоўкі «Факстрот», які пражывае па гэтым адрасе. «Сёння падобнае адбываецца паўсюль. Я жыву тут 13 гадоў, і цяпер становіцца па-сапраўднаму страшна: у краіне няма ўлады, якая кантралявала б сітуацыю», — паскардзіўся журналістам жыхар Хесельбю.

Неўзабаве пасля гэтага адбыўся яшчэ адзін выбух — у адным з жылых дамоў горада Лінчэпінг. Знешняя сцяна паваліласся, пакінуўшы ў фасадзе трохпавярховага дома раскрытую дзірку. Пацярпела 25-гадовая жанчына, якую даставілі ў шпіталь на машыне хуткай дапамогі. Як заявілі ў паліцыі, гэты выбух таксама стаў вынікам канфлікту этнічных банд. А ў ноч на 28 верасня выбух раздаўся ва Упсале. У адным з паўразбураных дамоў ратавальнікі знайшлі 25-гадовую жанчыну з цяжкімі траўмамі. Яе паспелі даставіць у бальніцу, але там яна памерла. У паліцыі паведамілі, што гэтая жанчына стала выпадковай ахвярай злачынства, мэта якога заключалася ў забойстве зусім іншага чалавека.

Усяго сёлета ў верасні ў выніку бандыцкіх разборак у Швецыі загінулі 12 чалавек. Шведы патрабуюць ад свайго ўрада, каб ён нарэшце зрабіў хоць нешта. І вось напрыканцы верасня прэм'ер-міністр Ульф Крыстэрсан паведаміў аб тым, што вырашыў задзейнічаць для барацьбы з бандамі ўзброеныя сілы дзяржавы. «Гэта цяжкі час для Швецыі. У канчатковым рахунку абавязкам дзяржавы з'яўляецца забеспячэнне таго, каб арганізаваныя злачынныя групоўкі не забівалі па адным чалавеку ў дзень у Швецыі», — сказаў прэм'ер-міністр, каментуючы выпадак ва Упсале. Зрэшты, выбухі працягвалі грымець і ў кастрычніку.

У НАТА таксама заклапаціліся шведскімі праблемамі. Штабны афіцэр альянсу Рафе Тэйн заявіў, што спецыялісты альянсу гатовы дапамагчы шведскім уладам у барацьбе з АЗГ. «Заўсёды ёсць хтосьці, хто стварае бомбу, хто яе ўстанаўлівае і хто плануе ўсю атаку. Неабходна паспрабаваць выявіць і спыніць прыток выбуховых рэчываў і мікрасхем у Швецыю», — заўважыў Тэйн. У сваю чаргу, Данія, Нарвегія і Фінляндыя выказалі гатоўнасць адправіць у Швецыю сваіх паліцэйскіх на дапамогу, бо самі шведы адкрыта «не вывозяць» сітуацыю. Як адзначыла iz.ru, суседзі надзвычай непакояцца, што шведская злачыннасць захлісне і іх.

### На лініі агню

Па выніках апытання міжнароднай маркетынгава-даследчай кампаніі Ipsos высветлілася: больш за 50 працэнтаў рэспандэнтаў ацэньваюць Швецыю як небяспечную краіну. Некаторыя ахвяры забойстваў — людзі, практычна не звязаныя з бандамі. Злачынствы адбываліся ў жылых комплексах і ў іншых месцах па-за межамі раёнаў рызыкі, якія звычайна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі. Гэта адна з прычын, чаму большасць апытаных класіфікуюць Швецыю як небяспечную краіну. Кожны пяты нават лічыць краіну вельмі небяспечнай. Да такой думкі больш схіляюцца жанчыны, чым мужчыны.

Шведскія СМІ звязваюць рост колькасці забойстваў у краіне з унутраным канфліктам у бандзе «Факстрот». Вядома, што яна раскалолася на дзве канкуруючыя групоўкі, паміж якімі рэгулярна адбываюцца сутыкненні. Шведская паліцыя мяркуе, што мясцовыя банды ўсё часцей выкарыстоўваюць дзяцей для ўчынення злачынстваў, паколькі дзеці да 18 гадоў часта атрымліваюць лёгкія прыгаворы ў судах або наогул застаюцца без пакарання. Паводле звестак праваахоўных органаў, дзеці ўсё больш малодшага ўзросту (некаторым усяго 10 гадоў) залучаюцца ў гандаль наркотыкамі і сярод іх расце колькасць тых, хто ў канфліктах выкарыстоўвае зброю са смяротнымі наступствамі. У Швецыі адносна лёгка можна купіць нелегальную зброю, якая паступае ў асноўным з балканскіх краін, лічыць паліцыя.

Як падкрэсліў у сваім звароце Крыстэрсан, ахвярамі ўнутраных канфліктаў банд усё часцей становяцца дзеці і мінакі. У мінулым годзе ў выніку перастрэлак у Швецыі загінула больш за 60 чалавек — найвышэйшы паказчык за ўсю гісторыю вядзення статыстыкі. Чакаецца, што па выніках 2023 года сітуацыя будзе настолькі ж дрэннай — ці яшчэ горшай.

У афіцыйнай урадавай справаздачы, апублікаванай у 2021 годзе, адзначаецца, што кожны год у выніку перастрэлак у Швецыі гінуць чацвёра з мільёна жыхароў — у параўнанні з 1,6 чалавека на мільён у сярэднім у Еўропе. У Швецыі зарэгістраваны самы высокі ў ЕС узровень вулічных забойстваў на душу насельніцтва. У лютым у дакладзе Савета па прафілактыцы злачынстваў паведамлялася, што ад агнястрэльнай зброі ў Швецыі загінула ў шэсць разоў больш людзей, чым ва ўсіх астатніх скандынаўскіх краінах разам узятых.

Паліцыя звязвае гвалт з дрэннай інтэграцыяй мігрантаў, разрывам паміж багатымі і беднымі, які павялічваецца, і ўжываннем наркотыкаў. Прэм'ер-міністр паабяцаў узмацніць жорсткасць пакарання за парушэнне законаў аб зброі, узмацніць паўнамоцтвы дзяржавы па дэпартацыі мігрантаў, настойваючы што «усе варыянты разглядаюцца».

### Вайна кланаў

Некаторыя крытыкі сцвярджаюць, што гэтыя меры не вырашаюць асноўныя сацыяльныя праблемы, у тым ліку дзіцячую беднасць і недастатковае фінансаванне грамадскай інфраструктуры. Карані праблемы, зрэшты, заключаюцца не толькі ў наплыве мігрантаў у Швецыю. У краіне ўкараніліся і такія злачынныя супольнасці, на чале якіх стаяць і рэспектабельныя, на першы погляд, прыродныя шведы. Журналіст Ёханес Вальстрэм і былы паліцэйскі Ян Персан напісалі кнігу «Кланы», прысвечаную шведскім арганізаваным злачынным групоўкам. «Мы вывучылі ўсе судовыя рашэнні па цяжкіх злачынствах у Швецыі за апошнія пяць гадоў — тысячы спраў. І выявілі досыць разгалінаваную сістэму, члены якой супрацоўнічаюць адзін з адным, нібы ў вялікім сямейным бізнесе. Так, за кароткі час у адным і тым жа раёне за збыт наркотыкаў асудзілі каля 30 чалавек. Нам удалося даказаць, што гэтыя людзі звязаны адзін з адным і што яны адправілі зароблена на рахунак адной і той жа кампаніі. Гэта мог быць рэстаран ці казіно, якія належаць сваяку ўсіх 30 асуджаных. Кланы дзеляць паміж сабой прыбытак ад злачынных дзеянняў, а таксама даходы ад некрымінальнай дзейнасці», — распавёў Вальстрэм. Суаўтары «Кланаў» сцвярджаюць, што арганізаваныя злачынныя групоўкі маюць сваіх прадстаўнікоў ва ўсіх структурах шведскага грамадства — на іх працуюць банкаўскія служачыя, палітыкі і муніцыпальныя чыноўнікі.

Па словах Вальстрэма і Персана, цяпер у Швецыі ардуюць каля 40 злачынных кланаў, якія штогод узбагачаюцца на казачныя сумы. «У справаздачы Еўракамісіі адзначаецца, што наша мясцовая злачыннасць штогод атрымлівае даход у палову дзяржаўнага бюджэту Швецыі. Гэта сотні мільярдаў крон. Яны займаюцца ўсім: ад прастытуцыі і махлярства да вымагальніцтва. Але крымінальны складнік — даволі нязначная частка агульнага фінансавага абароту кланаў. Яны актыўна займаюцца і здзелкамі з нерухомасцю, імпартам і экспартам тавараў. У аснову любога клана пакладзена строгая іерархія».

Вальстрэм не выключае, што з часам гэтыя кланы ўзнімуцца на новую прыступку магутнасці і ўжо адкрыта возьмуць уладу ў дзяржаве, падзяліўшы яе тэрыторыю на падкантрольныя ўчасткі. «Яны могуць стаць настолькі магутнымі, што нам, магчыма, давядзецца прывыкнуць да таго, што адна сям'я возьме пад кантроль Эрэбру, а другая — Хальсберг. Хоць пра гэта сёння і не хочуць казаць», — папярэджвае Ёханес Вальстрэм.

Швецыя прызнана самай крымінальнай краінай Паўночнай Еўропы, піша Samnytt са спасылкай на справаздачу незалежнай арганізацыі Global Initiaitve. Гандаль наркотыкамі, кантрабанда і злачынствы ў сферы сацыяльнага забеспячэння нідзе не распаўсюджаны гэтак жа шырока і не прыносяць столькі ж даходаў, колькі шведская арганізаваная злачыннасць. Гэтая краіна «ўсяго за дзесяць гадоў прайшла шлях ад краіны з адным з самых нізкіх у Еўропе ўзроўняў стральбы са смяротным зыходам да аднаго з самых высокіх», піша Financial Times.

«Для Швецыі гэта сацыяльны землятрус», — лічыць выканаўчы дырэктар рознічнага падраздзялення мэблевага гіганта Ikea Есепер Брадзін. «Калі гэтак жа будзе на працягу наступных двух дзесяцігоддзяў, то Швецыя проста развaліцца», — прадракае кіраўнік камітэта юстыцыі шведскага парламента Рычард Ёмсхоф.

**Захар БУРАК.**

На кантролі

# Ёсць парушэнні ў выкарыстанні бюджэтных сродкаў

## Будаўнічая сфера ў зоне павышанай увагі дзяржавы

**У Камітэце дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці праверылі, як вядзецца рэалізацыя рэспубліканскай і абласной інвестыцыйных праграм, а таксама будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай.**

— Ёсць шэраг станоўчых тэндэнцый у будаўнічай галіне за 2023 год. Напрыклад, за дзевяць месяцаў тэмп росту будаўніча-мантажных работ у параўнанні з мінулагоднім перыядам склаў амаль 110 %, падрадных работ з пачатку студзеня — амаль 116 %. Завершана будаўніцтва шэрагу значных аб'ектаў як сацыяльнай, так і вытворчай сферы. Разам з тым Камітэтам дзяржкантролю выяўлены недахопы ў рабоце будаўнічай галіны, у прыватнасці незаконнага і залішняга выкарыстання бюджэтных сродкаў, — паведаміў **старшыня КДК Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОШКА.**

Сёлета арганізацыі будаўнічай галіны вобласці, па даных кантралёраў, завысілі аб'ёмы і кошт будаўніча-мантажных работ на 1,5 мільёна рублёў.

Значныя парушэнні кантралёры знайшлі ў ходзе рэалізацыі інвестпраграмы па рэканструкцыі бальніцы пад паліклініку ў Астраўцы. Праверкі, якія вяліся на працягу года, устанавілі завышэнне кошту па суму амаль 200 тысяч рублёў.

— Шэраг парушэнняў датычыцца незаконнага атрымання бюджэтных сродкаў. Такія факты, у прыватнасці, выяўлены на аб'ектах сацыяльна-культурнага значэння і інжынерна-транспартнай інфраструктуры. Асаблівая ўвага надавалася аб'ектам новага мікраараёна Грандзічы ў абласным цэнтры, дзе вядзецца актыўная забудова. Гэта школа, дзіцячы садок, пажарнае дэпо і ўся адпаведная інфраструктура. Выніку праверкі выявілі завышэнне на суму 450 тысяч рублёў, — расказаў **начальнік аддзела кантролю будаўніцтва жыллёва-камунальнай гаспадаркі КДК Гродзенскай вобласці Мікалай КУЦ.**

Ён падкрэсліў, што да парушальнікаў прымаліся адпаведныя меры, у выніку якіх суб'ектамі гаспадарання вярталіся незаконна атрыманыя бюджэтныя сродкі, прычым з працэнтамі.

У рэгіёне з пачатку года ўведзена звыш 305 квадратных метраў жылля, што забяспечвае выкананне задання па ўводзе агульнай плошчы. Але ёсць праблемы з заданнем па жыллі, якое будуецца з дзяржпадтрымкай. Цяпер яго ўведзена 79 тысяч «квадратаў», што складае 78,4 % задання дзевяці месяцаў і 51 % гадавога аб'ёму. У вобласці тры шматкватэрных дома будуюцца з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў. Яшчэ 128 аб'ектаў знаходзяцца ў стане звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва, амаль палова з іх у такой сітуацыі цягам больш за пяць гадоў. У некаторых раёнах зацягваюцца тэрміны па засяленні арэнднага жылля.

У КДК закранулі і праблему будаўнічых кадраў. Не ва ўсіх раёнах удаецца захаваць будаўнічыя арганізацыі і забяспечыць іх эфектыўную работу.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

У тэму

### У ЖЫЛЫХ ЗАБУДОВАХ РЭГІЁНА СТАНОВЯЦЦА ПАПУЛЯРНЫМІ ЭЛЕКТРАДАМЫ І ТАЎНХАУСЫ

У Гродзенскай вобласці за 10 месяцаў пабудавана ў два разы больш жылля «на электрычнасці», чым за такі перыяд мінулага года. Гадавое заданне ўжо выканана амаль на 120 %. Большая частка — 46,5 тысячы «квадратаў» — прыходзіцца на шматкватэрныя дамы, яшчэ 13 тысяч — на індывідуальныя забудовы.

Як паведамілі ў камітэце па архітэктуры і будаўніцтву Гродзенскага аблвыканкама, найбольш актыўна электрадамы ўзводзяцца ў гродзенскім мікраараёне Грандзічы-4. Тут ва ўсіх навабудоўлях выкарыстоўваецца выключна электрычная энергія. Сёлета ў мікраараёне ўведзены ў эксплуатацыю два шматпавярховікі на 114 і 158 кватэр. Дамы будаваліся з дзяржпадтрымкай, таму прыярытэтнае права на жыллё атрымалі шматдзетныя сем'і, сем'і ваеннаслужачых і прыраўнаваных да іх службовых асоб. Да канца года мяркуецца завяршыць будаўніцтва яшчэ двух электрадамоў, на 190 кватэр кожны.

Жылыя дамы з электрычным ацяпленнем і гарачым водазабеспячэннем атрымалі распаўсюджванне і па вобласці. Дарэчы, першы электрадом быў пабудаваны ў Слоніме, а сёлета аналагічны дом ужо здадзены тут у эксплуатацыю. У канцы года плануецца ўвесці ў строй яшчэ адзін шматпавярховік на 105 кватэр. Таксама электрычныя дамы здадзены сёлета ў гарадскім пасёлку Зэльва. Дарэчы, такім чынам тут завяршылі даўгабуд. Электрадамы з'явіліся ў горадзе Бярозаўка Лідскага раёна, аграгарадку Васілішкі Шчучынскага раёна. А вось індывідуальныя дамы такога тыпу найбольш актыўна будуюць у Гродне, Гродзенскім, Смаргонскім, Лідскім і Ашмянскім раёнах.

У абласным цэнтры папулярнасць набываюць таўнхаусы — індывідуальнага і блакіраванага тыпу. Цяпер у Гродне два такія праекты ў стадыі будаўніцтва і яшчэ сем — у распрацоўцы. Дадзены кірунак ацэньваецца як запатрабаваны і перспектыўны ў вырашэнні жыллёвай праблемы. Мяркуецца, што будаўніцтва такіх дамоў будзе весціся больш актыўна. Адзін з праектаў, які доўжыўся тры гады, атрымаў увасабленне ў выглядзе 36 таўнхаусаў на ўскрайку горада, такі ж праект мяркуецца ажыццявіць і ў цэнтры Гродна. Для гэтых мэт будаўнічая кампанія набыла адпаведны ўчастак на аўкцыёне. Дарэчы, сярод тых, хто набывае дамы індывідуальнай забудовы, нямала жыхароў з іншых рэгіёнаў Беларусі.

Бяры і рабі

# ПРОСТЫЯ І СЦІПЛЫЯ «СУПЕРГЕРОІ» СЯРОД НАС

**Ужо за сто-дзвесце метраў да пункта прызначэння Таццяна прыслухоўваецца, адрознівае галасы падапечных. Яна ўваходзіць на тэрыторыю і патанае ў гуле прывітальных галасоў. Яе зачакаліся. У руках — «прылада працы» на бліжэйшыя дзве-тры гадзіны. Гэта павадок...**



— Знаёмцеся, Джонік, — прадстаўляе першага падапечнага і ледзь паспявае за трохлапым сабакам. — Яго прывезлі параненым, высветлілася, што нехта страляў, лапу ампутавалі. Сабака вельмі жвавы, жыццярадасны. Яму абавязкова трэба гуляць, рухацца. Каб не было далейшых праблем.

У гэтыя дні Гомель моцна заснежыла. Джонік цешыцца, фырчыць, апускаючы нос у снег, радуецца прагулцы.



— Зараз выдасць сябе, — усміхаецца Таня, паказвае на сабаку, які «гуляе» лежачы. — Гэта так хоча пажаліцца. Вось так амаль з кожным сабакам. Насамрэч, ім не столькі хочацца пабегаць ці зрабіць свае натуральныя справы, колькі хочацца ўвагі, ласкі: падстаўляць спіну, каб гладзілі, чухалі бакі.

Крыху больш за год таму гамяльчанка Таццяна Назаранка ўпершыню прыйшла на арандаваную пляцоўку валанцёрскай перападтрымкі безгаспадарчых сабак «Куток надзеі». Проста паглядзець, што такое валанцёрская работа з жывёламі, і... засталася.

— Трапіла да «сабачуль», як я іх называю, па запрашэнні знаёмай, якая ўжо доўгі час дапамагае «Кутку надзеі», — тлумачыць Таццяна. — Я вельмі баялася сабак, але хацела быць карыснай. Высветлілася, што для жывёл важна, каб з імі гулялі, размаўлялі, часалі ім за вушкам. Калі толькі прыйшла, то гуляла са старэнькімі сабакамі. Пацiху абвыкала і ўжо цяпер не баюся іх наогул. Прыйшло разуменне, што калі сабака захоча ўкусіць, то ён спачатку папярэдзіць.

Вось ужо больш за год кожны свой выхадны Таццяна праводзіць тут. Яна дапамагае з выгулам.

— Частка сабак утрымліваецца ў будках, што размешчаны ў доўгіх, працяглых выгульніках. У іх больш прасторы, і гуляць з імі можна не так часта. Другая частка сабак знаходзіцца ў невялікіх вальерах і іх вельмі важна выводзіць. Гэта не толькі магчымасць спакойна пачысціць вальер, але і пытанне клопату пра жывёл.

У звычайным жыцці Таццяна — спецыяліст бьюці-індустрыі. Яна самазанятая, аказвае касметычныя паслугі, працоўны графік у яе вельмі шчыльны, а выхадны, часцей за ўсё, адзін у тыдзень. Але дзве-тры гадзіны ў гэты выхадны ў любое надвор'е, у любым настроі і пры любым самаадчуванні яна выгульвае сабак. На сёння такім валанцёрскім дзяжурствам яна аддала звыш 160 сваіх гадзін. За год праз яе рукі прайшлі каля дваццаці сабак.

— Адно з самых частых пытанняў мне: як я свой цёплы, утульны кабінет, беленькі халацік мяняю на ўсё гэта? — прызнаецца Таццяна. — Дапамагаць не цяжка. Мяне радуе, што я таксама крыху датычная да важнай справы. Людзей, якія на валанцёрскіх пачатках хочуць дапамагаць у добрай справе, шмат. Валанцёрская праца з жывёламі можа быць вельмі рознай. Гэта дапамога з кармам, уборкай, шыццём папонак, уцяпленнем будак, выгулам...

Трэба разумець, што дапамога безгаспадарчым жывёлам — даставкова цяжкая і брудная праца, якая, да таго ж, патрабуе дакладнай дысцыпліны. Кожны валанцёр павінен дакладна захоўваць правілы паводзін, ведаць, як уваходзіць у вальер, як з яго выходзіць. Ёсць сабакі, якія вельмі баяцца гукаў, шуму.

Таня кліча на прагулку Стрэлку. З гэтым сабакам давялося запасціся цярпеннем.

— Жывёла маладая, і адразу відаць, што яе або білі, або спалохалі. Стрэлка наша наогул не рухаецца, калі глядзіць ёй у вочы, прыціскаецца да зямлі, хавае мыску. Я доўга шукала да яе падыход. Цяпер сабака ўжо дае сябе пагладзіць, выходзіць на мой голас з будкі, але трэба быць вельмі чулым, бо тут многія жывёлы псіхалагічна траўміраваны, — расказвае валанцёр.

Руды маладзенькі Рыч, што жыве ў адным вальеры са Стрэлкай, зусім іншы па характары, вельмі жвавы. За змену Таццяна звычайна паспявае выгуляць да васьмі-дзесяці сабак. Ёсць у яе ўлюбёнцы, з якімі гуляе абавязкова. Не так даўно адна з такіх — Муха — знайшла сям'ю. Для валанцёра гэта велізарная радасць і ў той жа час сум расстання. Муха, кажа Таццяна, навучыла яе не баяцца сабак, паказала, што такое, калі цябе чакаюць, любяць, пазнаюць здалёк тваё крокі. Сваіх падапечных валанцёр ужо не можа падвесці.

— Ведаю, што гэта збітая фраза: «дапамогі маленькай не бывае». Але гэта так. Можна прыйсці, каб проста паглядзець, вызначыць, ці гатовы ты да такой справы, чым канкрэтна можаш дапамагчы. Бо многія думаюць, што дапамагаць безгаспадарчым жывёлам — гэта абавязкова ахвяраваць грошы або адразу прыехаць і забраць дадому жывёлу. Насамрэч, мае значэнне любая ўвага, хаця б крыху твайго часу. Прыйшоў і пагуляў з адным сабакам, ці паглядзеў і расказаў знаёмым, калегам, дзякуючы чаму жывёла знойдзе дом. Калі чалавек нават адзін раз пагуляе — ужо выдатна, — перакананая гамяльчанка.

Таня падчас прагулак здымае відэа і выкладвае ў сацыяльныя сеткі. Так больш людзей даведваюцца пра сабак, якія шукаюць надзейны дом.

— Мая любімая Муха менавіта так знайшла новых гаспадароў. Вельмі прыемна, калі можаш дапамагчы гэтым жывёлам. Напрыклад, мая кліентка — настаўнік пачатковых класаў, расказала аб валанцёрстве вучням. Дзеці папрасілі зняць для іх відэа і расказаць пра сабак, з якімі я гуляю. Пагледзелі ролік і бацькі. Па сутнасці, усе яны ўжо сталі валанцёрамі, бо захацелі дапамагчы жывёлам. Дзеці запісалі для мяне відэа ў адказ. Гэта было вельмі кранальна. Час ад часу вучні і бацькі збіраюць грошы, купляюць і перадаюць корм для сабак. Сярод маіх знаёмых ёсць тыя, хто таксама захапіўся валанцёрствам: яны прыходзяць даглядаць сабак і гуляць з імі, — шчыра радуецца Таццяна Назаранка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# НІ ПУХУ, НІ ПЕР'Я

## Час выбіраць пухавік

**Перажыць зіму ў нашых шыротах наўрад ці магчыма без пухавіка. Лёгкая вага і прастата ў даглядзе робяць яго незаменным і ў мароз, і ў слоту. Калісьці ад пухавіка патрабавалася толькі практычнасць, але сёння ён становіцца асновай зімовых вобразаў, паколькі сучасным мадэлям уласцівыя і стыльны крой, і разнастайнасць дызайнерскіх рашэнняў.**

Як не патануць у моры варыянтаў і абраць той самы пухавік, які будзе служыць вам верай і праўдай не адзін халодны сезон? Тут важна спалучэнне «тэхнічных характарыстык» і модных тэндэнцый — зразумела, з улікам асаблівасцяў вашай фігуры, таму што менавіта гэты від адзення зусім не дарує памылак.

### 3 ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ МОДЫ

Што ж сёння ў модзе ў дачыненні да пухавікоў? Зразумела, **аверсайз** — фаварыт шматлікіх куцюр'е ўжо не першы сезон. Такі крой дае магчымасць апрануць пад яго любую колькасць цёплых рэчаў, так што вы сапраўды не



змерзнеце нават у лютыя маразы або ў самыя золкія дні. Зрэшты, у гэтым сезоне аверсайз стаў умераным у адрозненне ад сезонаў папярэдніх, калі ў неабсяжныя пухавікі модніцы хуталіся, як у пуховую коўдру. Але нават на ўмераным варыянце вялікі пухавік падыдзе не ўсім. Ідэальны ён для высокіх хударлявых дзяўчат — зрэшты, на такіх дзяўчатах добра выглядае любая мадэль. Невысокі рост або «шырокая костка» патрабуюць пры выбары аверсайз-мадэляў пухавікоў некаторай асцярожнасці і добрага густу. І яшчэ адзін нюанс (ён датычыцца доўгіх аверсайз-пухавікоў): калі ўжо вы абралі такі варыянт, насіце яго з артыстызмам! Гэта значыць, камбінуйце не з угамі або грубымі чаравікамі, спартыўнымі штанамі ці джынсамі-мом, а з вытанчанымі трыкатажнымі сукенкамі, спадніцамі, са стыльнымі батфортамі на плоскай падэшве і нават з жаноцкім абуткам на абцасе (зрэшты, з пункта гледжання практычнасці ва ўмовах нашай зімы, абцас можа быць і шырокім, устойлівым). А напярэдадні навагодніх вечарынак падглядзець, як камбінаваць вячэрнія сукенкі з аверсайз-пухавікамі, можна ў зорак: такія вобразы любяць Кім Кардаш'ян і Рыяна. Заўважым, што добры пухавік дае магчымасць насіць зімой рэчы любога сезона, нават летняга. І гэта яго несумненны плюс.

Актуальныя гэтай зімой і **скарочаныя пухавікі** — дзевяностыя і нулявыя па-ранейшаму натхняюць дызайнераў. Аб'ём тут дасягаецца не з-за беспамернасці, а дзякуючы інавацыйным матэрыялам. У гэтым сезоне трэндавыя скарочаныя пухавікі даходзяць да сярэдзіны таліі і даюць прастор для стварэння самых розных вобразаў — ад мілітары да спартыўных. Але ёсць адзін мінус — холадна. Як асноўнае адзенне на зіму такі пухавік, вядома, не справіцца са сваёй задачай, але як дадатковы варыянт на адлігу (а пацяпленні для беларускай зімы не рэдкасць!) — падыдзе цудоўна.

**Пухавік-паліто** — бестселер ужо не першы сезон (калі казаць дакладна, то чацвёрты). Такі пухавік можна ўбачыць у розных варыянтах: як у доўгім, так і ў кароткім, але абавязкова з поясам, які падкрэслівае стан. Такія мадэлі прыйдуцца па душы аматаркам элегантнасці: калі жадаеце выглядаць вытанчана, шляхетна і пры гэтым модна, ды яшчэ і не змерзнуць, паліто-пухавік — ідэальны выбар. Падыходзіць мадэль для стварэння стыльных спалучэнняў са спадніцамі, вязанымі сукенкамі, блэйзерамі і наогул для любых вобразаў у дзелавым стылі. А калі дапоўніць вышэйназваныя строгія выявы, напрыклад, грубымі чаравікамі на трактарнай падэшве, гэта дабавіць агульнай карціне нотку нефармальнасці і ператворыць трохі сумны офісны look у моднае выказванне.

### ДАДАЙЦЕ ФАРБАЎ

У нашу манахромную бела-шэрую зіму сёлета дызайнеры раяць унесці яркія каляровыя плямы. Чорны пухавік — гэта, вядома, стыльна і ўніверсальна, шэрая гама цяпер у трэндзе, як і карычневыя тоны, але найбольш актуальнымі колерамі для пухавікоў сезона 2023/24 названы пунсовы, глыбокі зялёны і, уявіце сабе, ружовы, у стылі Барбі. Эфектныя вобразы ўзімку можна ствараць пры дапамозе белага пухавіка, а таксама мадэляў у нюдавай бэжавай гаме, хоць, вядома, гэта не самы практычны выбар. Актуальна таксама будуць выглядаць пухавікі ў попельных і жамчужных тонах — гэтая каляровая палітра, дарэчы, валодае яшчэ і амаладжальным эфектам (у цэлым, пудравая гама заўсёды робіць колер твару больш свежым). Ну а яркія колеры — не толькі пунсовы, ружовы і раней неўласцівы зімовым рэчам насычана-зялёны, але і ліловы, каралавы, мятны — дададуць некалькі градусаў да вашага настрою. Спакойная каляровая гама таксама не абавязана гэтай зімой быць зусім ужо пурытанскай: можна прыглядзецца да гарчычнага колеру ці тонаў хакі.



### ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Як вядома, найболей распаўсюджаныя тыпы жаночых постацяў — «прамавугольнік» (аб'ёмы плячэй і сцёгнаў прыкладна роўныя, талія выразна не выяўлена), «круг» ці «яблык» (талія, ізноў жа, выяўленая слаба, грудзі і сцёгны досыць аб'ёмныя пры стройных нагах), «груша» (шырокія сцёгны і аб'ёмная верхняя частка ног, пры гэтым тонкая талія і вузкія плечы). Ёсць яшчэ варыянт «пясочны гадзіннік», але такім дзяўчатам падыходзіць амаль усё, а таксама «перакулены трохвугольнік», ён жа спартыўны тып фігуры, але такі сустракаецца радзей вышэйназваных. Так што спынімся на першых трох тыпах.

Калі ваша фігура належыць да тыпу «прамавугольнік», то цяпер — ваш час! У трэндзе пухавікі з поясам, і менавіта такія мадэлі вам раяць выбіраць стылісты. Галоўнае — пазбягаць непатрэбнага дэкору, робячы выбар на карысць лаканічнасці. А калі «прасцёжка» яшчэ і вертыкальная, то выглядаць вы будзеце на некалькі сантыметраў вышэйшымі за свой рэальны рост.

Калі ваша постаць — «яблык», крой пухавіка лепш абраць прамы. Аверсайз, у прынцыпе, ваша гісторыя, але лепш — умераны, а не празмерны. А вось модныя сёння пухавікі з поясам (раменьчыкам) могуць падкрэсліць жывоцік. Стракатых прынтаў ці, крый божа, бліскучых/неонавых варыянтаў таксама варта пазбягаць: бляск тканіны заўсёды дадае аб'ём. Затое яркія колеры цалкам дапушчальныя.

Фігура тыпу «груша» дазваляе і нават вітае аб'ёмныя кароткія пухавікі: да сярэдзіны таліі або да




сярэдзіны сцягна. Але ў апошнім варыянце трэба ўлічваць нюансы крою, каб дадаткова не «пашырыць» сцёгны. Выйгрышна будуць глядзецца накладныя кішэні і наогул любыя «надзьмутыя» дэталі ў верхняй частцы цела.

### ТЭХНІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ

Сёння ў крамах і на рынках прадстаўлены мадэлі пухавікоў з розных матэрыялаў і з розным напаўненнем — гусіныя (качыныя) пух і пяро, сінтэпон, холафайбер, ваўняны вацін, цінсулейт. Пагаворым пра «начынне».

Самы дарагі яе варыянт (які лічыцца і самым лепшым) — натуральны пух. Але, насамрэч, сінтэтычныя напаўняльнікі часам маюць значныя перавагі перад натуральнымі. І гэта не толькі ніжэйшы кошт. Сінтэтычны напаўняльнік дае магчымасць мыць і сушыць выраб у хатніх умовах, не асцерагаючыся, што «начынне» саб'ецца. Сучасны штучны напаўняльнік да таго ж не «лезе» і з'яўляецца гіпаалергенным. І часам ён цяплейшы за пух. Гэтым можа пахваліцца, напрыклад, інавацыйны матэрыял цінсулейт — ён уяўляе сабой сплячэнне найтанчэйшых сінтэтычных валокнаў (у 10 разоў танчэйшых за чалавечы волас). Ствараючы паветраную падушку, такое «начынне» надзейна абараняе ад холаду. Заўважым, што цінсулейт у 1,5 раза цяплейшы за натуральны гусіны ці качыны пух.

Калі напаўняльнік натуральны (і нават калі штучны), варта ўлічыць таксама памер прастрочаных сегментаў: у ідэале яны не павінны быць большымі за 15х20 см. Пры буйнейшых «секцыях» паміж радкамі напаўняльнік можа з часам збіцца і, страціўшы раўнамерную таўшчыню, перастаць выконваць сваю функцыю — абарону ад нізкіх тэмператур.

Што да тканіны, з якой пашыты пухавік, то ў ідэале яна павінна быць не толькі непранікальнай для снегу і дажджу і надзейна абараняць ад халоднага ветру, але адначасова прапускаць паветра з унутранага боку, каб не ўзнікала эфекту цэлафанавага мяшка. З гэтай задачай нядрэнна спраўляюцца сучасныя мембранныя тканіны. У вырабе пажадана павінна быць натуральная падкладка — яна робіць пухавік даражэйшым, чым мадэлі з падкладкай з поліэстэру або віскозы, але ў дадзеным выпадку, калі фінансы не спяваюць рамансы, лепш не скупіцца.

Выбіраючы пухавік, улічвайце: насіць яго вы будзеце практычна кожны дзень на працягу доўгіх зімовых месяцаў, так што да набыцця гэтага варта паставіцца адказна. Таму звяртаем і на такі немалаважны нюанс, як якасць фурнітуры. Кнопкі, маланкі, іншыя віды зашпілек павінны быць ушыты якасна і працаваць спраўна. Ну і капюшон, зразумела, пажаданы і нават абавязковы — важна, каб ён меў надзейную зашпільку або яго шырыню можна было рэгуляваць, інакш вецер будзе раз-пораз зрываць яго з галавы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛГРАН»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Аппарат для нагрева и охлаждения воды YLR2-5-X, инв. № 1697_; водонагреватель EPPV-27, инв. № 1666; водонагреватель электрический Timberk SWH MS2 10 H, инв. № 6346; аппарат для нагрева и охл. воды YLR2-5-X, инв. № 1697 | 136,08 | 13,61 | 6,80 |
| 2 | Принтер HP Laser Jet Pro MFP M132a RU (G3Q61A) A4, белый, инв. № С-27426; принтер HP LasserJet P1102, инв. № 8888; принтер Kyocera KM-1635, инв. № 650; принтер Canon i-sensys, инв. № 679; принтер Canon LBP2900, инв. № 601; принтер Canon i-sensys, инв № 600; принтер LaserJet P1005, инв. № 1829; МФУ Canon MG 2440; принтер МФУ HP LaserJet M1132, инв. № 687; МФУ Canon i-sensys MF4750 с картриджем, инв. № 5270; принтер Canon i-sensys LBP3010B, инв. № 677; принтер лазерный HP Laserjet 1010, инв. № 1827 | 903,24 | 90,32 | 45,16 |
| 3 | Зеркало, инв. № 413; зеркало, инв. № 413 | 7,92 | 0,79 | 0,40 |
| 4 | Комплекты мебели: бухгалтерия 1. Шкаф для документов со стеклом, 2 шт.; комплекты мебели: бухгалтерия 2. Шкаф для документов закрытого типа, 6 шт.; комплекты мебели: бухгалтерия 3. Шкаф с полками для одежды, 2 шт.; комплекты мебели: бухгалтерия 4. Тумба офисная, 3 шт.; комплекты мебели: бухгалтерия 5. Стол письменный, 4 шт.; комплекты мебели: бухгалтерия 6. Тумба под стол, 3 шт.; комплекты мебели: бухгалтерия 7. Стол овальный; комплекты мебели: бухгалтерия 8. Комод; комплекты мебели: бухгалтерия 9. Приставной стол (инв. № 1860) | 488,88 | 48,89 | 24,44 |
| 5 | Аппарат факсимильный Panasonik KX-FC966, инв. № 1720; ИБП Powerex VI650LED, инв. № 9719; факс Panasonic; телефонный аппарат Panasonic KT-TS, инв. № 247; радиотелефон Panasonic KT-TG, инв. № 312; телефон сотовый GSM Nokia X 16Gb, инв. № 853; телефон сотовый ZTE F327S черный, с/н 864581034946230, инв. № 13205; телефон сотовый Huawei P40 lite E полночный черный, с/н 864754042565363, инв. № 12966; телефон сотовый Huawei P40 lite E полночный черный, с/н 864754043711222, инв. № 12967 | 148,32 | 14,83 | 7,42 |
| 6 | Тепловентилятор эл. Scoole SC FH, инв. № 11447; тепловентилятор эл. Scoole SC FH SP 20 02, инв. № 11447; нагреватель воздуха электр. Ecoterm EHR-03/1E, инв. № 12373 | 19,08 | 1,91 | 0,95 |
| 7 | Эл. обогреватель масл. «Термия», инв. № 918; эл. обогреватель масл. «Термия»; эл. обогреватель масл. «Термия», инв. № 914; обогреватель масляный «Термия»; эл. обогреватель масл. «Термия», инв. № 916; эл. обогреватель «Термия», инв. № 907; обогреватель; обогреватель | 110,52 | 11,05 | 5,53 |
| 8 | Сейф ASM.63.T-EL, инв. № 114; сейф BS-T750, инв. № 110; сейф ASM.63T-EL, инв. № 111; сейф ASM.63.T-EL, инв. № 113 | 511,20 | 51,12 | 25,56 |
| 9 | Калькулятор Citizen CDC444S, инв. № 8540; калькулятор Citizen, инв. № 228; калькулятор Citizen SDC-554S, инв. № 456; калькулятор Citizen SDC-664S, инв. № 928; калькулятор 16 разр. Rebell SDC-664, инв. № 8884 | 22,32 | 2,23 | 1,12 |
| 10 | Холодильник «Атлант» МХМ 162, инв. № 1640; холодильник INDESIT TT85.001-WT, инв. № 1642; холодильник «Атлант» 2822-80, инв. № 1640 | 219,60 | 21,96 | 10,98 |
| 11 | Шкаф со стеклом, инв. № 1855/1, угловая полка (набор мебели: каб. юриста), инв. № 1859; шкаф гардеробный, инв. № 1855/3; стол с вырезом и тумбой, инв. № 1855/4 | 96,84 | 9,68 | 4,84 |
| 12 | Часы, инв. № 1644; часы, инв. № 1644; глобус-бар, инв. № 365; банкетка, инв. № 4847; вешалка напольная, инв. № 533; набор настольный (бордовый 7 предметов), Латвия, инв. № 6388 | 136,80 | 13,68 | 6,84 |
| 13 | Печь СВЧ, инв. № 1462; холодильник MPM-46-CJ-02, инв. № 1734; эл. плитка ENERGY EN-901, инв. № 11765; эл. чайник Skarlett SC-1025, инв. № 4535; кофемашина автоматическая Saeco Syntia, инв. № 1000_; | 227,52 | 22,75 | 11,38 |
| 14 | Огнетушители, инв. № 317, 318, 3 шт.; огнетушитель ОП-4, инв. № 237, 3 шт. | 47,52 | 4,75 | 2,38 |
| 15 | Блескомер WGG60-S, инв. № 451 | 720,00 | 72,00 | 36,00 |
| 16 | Ноутбук HP G72-b01ER, инв. № 663; маршрутизатор Keenetic Lite, инв. № 100841; ноутбук HP Envy 17-Joder, инв. № 1634; ноутбук HP Envy 470 GO, инв. № 1636; ноутбук HP Envy 470 GO, инв. № 1636*; нетбук Samsung; маршрутизатор Keenetic KN 1711, инв. № 100842 | 479,88 | 47,99 | 23,99 |
| 17 | Комплект мебели (гостевая) 1. Кухонный шкаф-стол; комплект мебели (гостевая) 2. Кухонный модуль, 2 шт.; комплект мебели (гостевая). 3. Кухонная столешница; комплект мебели (гостевая). 4. Полка, 3 шт.; комплект мебели (гостевая). 5. Журнальный столик (инв. № 1866*); комплект штор д/гостевой дир., инв. № 1404 | 62,28 | 6,23 | 3,11 |
| 18 | Комплект мебели (главный инж.). 1. Стол для переговоров; комплект мебели (главный инж.). 2. Стол; комплект мебели (главный инж.). 3. Приставка к столу; комплект мебели (главный инж.). 4. Тумба; комплект мебели (главный инж.) 5. Шкаф для документов; комплект мебели (главный инж.). 6. Шкаф гардеробный, 2 шт.; комплект мебели (главный инж.). 7. Шкаф со стеклом (инв. № 1861) | 287,28 | 28,73 | 14,36 |
| 19 | Комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству). 1. Шкаф-витрина; комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству). 2. Шкаф со стеклом, 2 шт.; комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству). 3. Угловой стол; комплект мебели (кабинет зам. дир. по строительству). 4. Тумба (инв. № 2962) | 402,84 | 40,28 | 20,14 |
| 20 | Комплект мебели (приемная) + обогреватель «Каскад». 1. Рецепшен, 2 шт.; комплект мебели (приемная) + обогреватель «Каскад». 2. Обогреватель; комплект мебели (приемная) + обогреватель «Каскад». 3. Тумба; комплект мебели (приемная) + обогреватель «Каскад». 4. Шкаф гардеробный; комплект мебели (приемная) + обогреватель «Каскад». 5. Шкаф со стеклом, 4 шт.; комплект мебели (приемная) + обогреватель «Каскад». 6. Тумба с роллетом (инв. № 1853); КСА Миника-НТС 1102Ф, инв. № 5890; вешалка м15, инв. № 276 | 338,40 | 33,84 | 16,92 |
| 21 | Стол фрезерованный с пропуском на хром. опорах, инв. № 6839; печь микроволновая HORIZONT 20MW800-1479, инв. № 1790; стол прямой 145*56*91, инв. № 1862/4; эл. чайник Bosch, инв. № 1308 | 126,72 | 12,67 | 6,34 |
| 22 | Шкаф для документов со стеклом, инв. № 6850; подставка под системный блок подкатная 250*480*120, инв. № 6845; тумба 83*80*40, инв. № 1862/6; тумба 83*80*40, инв. № 1862/6*; шкаф для документов | 81,72 | 8,17 | 4,09 |
| 23 | Монитор LG, инв. № 637; принтер лазерный SENSYS LBP3000, инв. № 602; принтер Samsung; Монитор Samsung, инв. № 661; копировальный аппарат CANON FC 128, инв. № 668; принтер HP LJ 1010, инв. № 1821; монитор 17 LG 1718S, инв. № 629; ПЭВМ ICS в комплекте с монитором Samsyng SyncMaster 943, инв. № 660; принтер XEROX | 301,20 | 30,12 | 15,06 |
| 24 | Вентилятор FA-5557 напольный, инв. № 1376; печь м/в («Горизонт»), инв. № 1485; эл. обогреватель «Термия» | 49,20 | 4,92 | 2,46 |
| 25 | Ваза Габбро полир. высота 250 мм ЭН, инв. № 8648; ваза Габбро б-н, инв. № 7189; бетонная полуваза, инв. № 9617; бетонная полуваза, инв. № 9618 | 1008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 26 | Подшипники по описи 10.5 в ассортименте (480 шт.); подшипник качения 1680207АК10С17(RU), 2 шт., инв. № 101710 | 3762,00 | 376,20 | 188,10 |
| 27 | Угольник УШ 630х400 3 шт., инв. № 48; пика для отбойного пневмомолотка 6 шт., инв. № 55; пика к отб. молотку (МО-2,3,4), 3 шт., инв. № 1324; пика-зубило П-31 к отб. молотку (МО-2), 2 шт., инв. № 209; катушка МО-100Б 380В ПВ 100, 1 шт., инв. № 7618; кольцо А55 20 шт., инв. № 1012; кольцо А80 20 шт., инв. № 1024; кольцо Б35 30 шт., инв. № 1025; фильтр комбинированный РУ-60М марка А1Р1D 12 шт., инв. № 6522 | 462,00 | 46,20 | 23,10 |
| 28 | Щетка абразивная 320 36 шт., инв. № 1754; щетка абразивная 46 50 шт., инв. № 1752; щетка абразивная 120 48 шт., инв. № 1753; щетка абразивная 500 12 шт., инв. № 1754 | 1314,00 | 131,40 | 65,70 |
| 29 | Линейка изм. 1000 мм b40 2 шт., инв. № 459; линейка изм. 300 мм 7 шт., инв. № 588; линейка изм. 500 мм 3 шт., инв. № 593; рамка 2-м верт. EEM-V-302-20, инв. № 1441; рамка 2-м верт. EEM-V-302-10, инв. № 1442; рамка 2-м гориз. EEM-G-302-20 10 шт., инв. № 1443; рамка 3-м верт. EEM-V-303-20 4 шт., инв. № 1444; рамка 3-м гориз. EEM-G-303-20 2 шт., инв. № 1445; рамка 4-м верт. EEM-V-304-10 2 шт., инв. № 1446; рамка 4-м гориз. EEM-304-20 3 шт., инв. № 1447; рамка 4-м гориз. EEM-G-304-10, инв. № 1448; розетка 1-м EET01-034-20 5 шт., инв. № 1449; розетка 1-м RJ-45 EEK01-035-20 5 шт., инв. № 1450; Розетка 1-м EEA00-027-20 2 шт., инв. № 1451; розетка 2-м EET01-134-20 2 шт., инв. № 1452; розетка RJ-45 EEK00-135-10 5 шт., инв. № 1453; розетка 1-м EEA00-027-10 3 шт., инв. № 1455; выключатель 2-кл с индикатором 10А (11 шт.), инв. № 1440; коробка разветвител. 108х108х58 КС 7 шт., инв. № 1457; гигрометр ВИТ-1, инв. № 164; устройство ИЗУ 70-400 10 шт., инв. № 1500; выключатель ВА 47-63-3 25А 3 шт., инв. № 1497; доводчик №3 бол. до 80 кг серый, инв. № 6486; разъем РШ-ВШ-30 25А 8 шт., инв. № 1282; коробка уст. СП 68-40 5 шт., инв. № 1456 | 181,98 | 18,20 | 9,10 |
| 30 | Круг шлиф. 63*20*20 (991), инв. № 3622; сальник 240х280 (1902), 82 шт., инв. № 947; инструмент гибкий шлиф. Д100№Р 6 шт., инв. № 1248; алмазный гибкий шлифовальный круг д100 2 шт., инв. № 5311; инструмент гибкий д100 р Т 2 шт., инв. № 1590; инструмент гибкий шлифовальный (3 шт.), инв. № 1328; уплотнение вала 65х85х10 RST 7 шт., инв. № 3731; виброметр; инструмент алмазный на орг. связ. станд. 28-20 1,72 шт., инв. № 12932; инструмент алмазный шлиф. стандарт из синтетич. алмазов Д250, АС 200/160 2 шт., инв. № 9897; инструмент алмазный на органической связке стандарт д250 200-160, инв. № 9897; полировальник ф200 мм, инв. № 1487; фреза алмазная ФАШ д200 гринт люкс, инв. № 1339; инструмент шлиф. ф200х22р 7/5 АП-1 2 шт., инв. № 1424; инструмент шлиф. ф200х22р 5/3 АП-1, инв. № 1425 3 шт., инв. № 1425; полировально-шлиф инстр. д190-200, 8 шт., инструмент АС ф190 28/20 60к тип «Чашка», инв. № 1240; инструмент АС ф190 40/28 тип «Чашка» 4 шт., инв. № 1241; инструмент АС ф190 28/20 тип «Чашка» 2 шт., инв. № 1242; инструмент АС ф190 14/10 тип «Чашка», инв. № 1246 | 742,91 | 74,29 | 37,15 |
| 31 | Микроволновка Midea, инв. № 1462; огнетушитель 5 шт.; напольное покрытие 3 $м^2$ (резиновый настил), инв. № 132; термовоздуходувка GHG660, инв. № 4510; УШМ DeWalt; набор головок и бит 94 пр. 1/4", 1/2" PRO STARTUL NEW CASE, инв. № 12378; УШМ Makita; тепловентилятор ARESA 2000 Вт, инв. № 12099; эл. обогреватель масл. «Термия», инв. № 913_*; ящик силовой ЯБЗ-250-3р с пред., инв. № 1522; огнетушитель ОП-8 (10), инв. № 176; огнетушитель ОП-4 з МИГ, инв. № 317; огнетушитель ОУ-3, инв. № 318; огнетушитель, 2 шт.; конвектор Ballu BEC/SM-1000/арт. 128679, инв. № 12055; лопата штыковая 205400 мм с ребрами жесткости Startul Garden, инв. № 11820; эл. обогреватель «Термия», инв. № 913; конвектор эл. «Термия» ЭВНА 2,0/230 С2 2,0 с ножками опорными, инв. № 101226, 101227; перфоратор BOSCH GBH 2-24, инв. № 499; аккумуляторная батарея, инв. № 4272; аккумуляторная батарея, инв. № 11284; аккумуляторная батарея СТАРТ. БАТ 6СТ-190 (2 шт.), инв. № 9316; | 948,60 | 94,86 | 47,43 |
